Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 САКАВІКА 2018 г. СЕРАДА № 49 (28665)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Чаму нельга запускаць гастрыт
СТАР. 8

Пра заробкі педагогаў і не толькі
СТАР. 9

Ку́пальных спраў майстры
СТАР. 13

ЛІЧБА ДНЯ

100,9 %

склаў індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў лютым 2018 года ў параўнанні са студзенем; са снежнем 2017 года — 101,7 %, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Харчовыя тавары ў лютым падаражэлі на 0,6 % у параўнанні са студзенем 2018 года і на 3,9 % у параўнанні з лютым 2017-га. Цэны на нехарчовыя тавары выраслі на 0,2 % у параўнанні са студзенем 2018 года і на 2,2 % у параўнанні з лютым папярэдняга года. Індэкс цэн і тарыфаў на платныя паслугі ў лютым склаў 102,5 % да студзеня 2018 года і 110,9 % да лютага 2017 года.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 11°
Віцебск	+ 3°
Гомель	+ 3°
Гродна	+ 8°
Магілёў	+ 3°
Мінск	+ 6°

ISSN 1990 - 763X

Кісяя з Гарадка

Дырэктар Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору народны майстар па ткацтве Марына ГУШЧА *(на фота справа)* і яе вучаніца Яніна КЛІМЕНКА, маладая ткачыха гэтай установы і кіраўнік гурт-ка, робяць вэлюм для маладой з ільну для калекцыі Віцебскага абласнога метадычнага Цэнтра традыцыйнай культуры і народ-най творчасці. Менавіта гарадоцкія ткачыхі знайшлі і аднавілі старажытную тэхналогію ажурнага ткацтва, якая па-народнаму называецца кісяя. Гэтая тэхналогія ў 2013 годзе ўнесена ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

— Гарадоцкая кісяя вядома з канца васямнаццатага стагод-дзя, — кажа Марына Леанідаўна. — Мы выкарыстоўваем для ткацтва свой, беларускі, матэрыял — ніткі Аршанскага льно-камбіната.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Тэма для абмеркавання

БАРАЦЬБА ЗА «ЧЫСТЫЯ» ПРАДУКТЫ

Што нам дасць Закон «Аб вытворчасці і абароце арганічнай прадукцыі»

За апошнія паўстагоддзя прыкметна ўзмацнілася залежнасць інтэнсіўнай сельскай гаспадаркі ад унясення мінеральных угнаенняў, пестыцыдаў, гербіцыдаў, выкарыстання хімічна сінтэзаваных сродкаў абароны раслін, энергаёмістай тэхнікі. Гэта ставіць пад пагрозу здароўе прыроды і чалавека. Рэшткавыя дозы хімічных элементаў назапашваюцца ў глебе, у прадуктах харчавання. Менавіта таму ў свеце з'явіўся новы трэнд — вырошчванне экалагічна чыстых прадуктаў. Не засталася ўбаку ад яго і наша краіна. Але для таго, каб падобная вытворчасць не стала стыхійнай, патрэбна заканадаўчая база. Пакуль праект Закона «Аб вытворчасці і абароце арганічнай прадукцыі» знаходзіцца на разглядзе ў Палаце прадстаўнікоў. Карэспандэнт «Звязды» пабывала на адным з яго абмеркаванняў у профільнай камісіі.

СТАР. 5

ВОГНЕННЫЯ «БЫЧКІ»

Да чаго можа прывесці курэнне на балконе?

Вясна на вуліцы ўжо пакрысе ўступае ў свае правы. На балконы зноў пацягнуцца курыльшчыкі. Вось толькі недакуркі яны не заўжды складваюць у попельніцу, а адпраўляюць іх у «вольнае падзенне». І невядома, ці даляцяць тыя да зямлі (забрудзяць наваколле) або стануць непрыемным «сюрпрызам» для кагосьці з суседзяў.

...З-за таго, што аўтамабілі ў суседнім двары стаялі прыпаркаваныя ў тры шэрагі, прыбраць снег адтуль было немагчыма. Таму, каб не мясіць кашу і не пэцкаць абутак, вырашыў пайсці ўздоўж дзевяціпавярховіка па прачышчанай сцежцы. І раптам перада мной зваліўся чыйсьці недакурак. Я тут жа ўзняў галаву, каб выказаць гаспадару недакурка ўсё, што пра яго думаю, — вядома ж, у межах прыстойнасці. Але дзе ты там знойдзеш неахайнага курца, калі над табой вокны 64 кватэр?

А мінулым летам «бычок» заляцеў і да мяне на лоджыю. На вуліцы тады было каля трыццаці градусаў вышэй за нуль. Натуральна, сядзець з задраенымі вокнамі ў такое спякотнае надвор'е не вельмі хацелася. І, лежачы на канапе, бакавым зрокам заўважыў, як зверху «верталёцікам» проста на падаконнік планіруе недакурак. На шчасце, побач стаяла банка з вадой, якую я тут жа і выплюхнуў на нязванага госця. Адкуль ён прыляцеў — чорт яго ведае...

— Дакладнай статыстыкі, колькі ж пажараў узнікла з-за безадказ-ных курцоў, у ратавальнікаў няма, — кажа **афіцыйны прадстаўнік Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Вольга МЕЛЬЧАНКА.** — Але такія выпадкі раз-пораз трапляюць у зводкі. Увосень 2016 года экіпаж ратавальнікаў выехаў на сталічную вуліцу Каліноўскага. Паступіла паведамленне аб тым, што ў доме на першым паверсе палае балкон. Ратавальнікі прыбылі літаральна праз пяць хвілін, але... балкон тады згарэў цалкам.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

НАПЕРАДЗЕ — ІНВЕСТЫЦЫІ І ТЭХНАЛАГІЧНЫ ПАРК

Місія завяршаецца, а супрацоўніцтва — не. У хуткім часе цяперашні пасол Індыі ў Беларусі Панкадж Саксена скончыць сваю работу ў нашай краіне. Што зроблена ім за гэты час і як развіваюцца ўзаемаадносіны нашых краін? Пра гэта ішла размова падчас сустрэчы пасла і Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

«Індыя для нас важная краіна, з якой мы хацелі б заўжды мець вельмі цёплыя, добрыя адносіны. У нас вялікая гісторыя, вялікі фундамент узаемаадносін, якія пачынаюцца яшчэ з савецкіх часоў, нашага сяброўства паміж дзвюма велізарнымі дзяржавамі. Тады былі закладзены асновы нашых адносін. І добра, што мы захавалі гэта сяброўства», — сказаў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка дзяржавы, ён сустракаецца з тымі замежнымі пасламі, якія ўнеслі значны ўклад ва ўмацаванне двухбаковых адносін. «Я лічу, што ў вас атрымалася вельмі шмат зрабіць для таго, каб зблізіць нашы дзяржавы», — падкрэсліў заслугі пасла беларускі лідар. Тым больш у апошні час двухбаковы дыялог быў вельмі інтэнсіўным. Пра гэта сведчаць узаемныя афіцыйныя прэзідэнцкія візіты. «Мы прапанавалі цікавыя варыянты для індыйскіх бізнесу, дзяржавы тут, у цэнтры Еўропы. І я хачу, каб вы перадалі кіраўніцтву Індыі, што мы свята будзем прытрымлівацца гэтых дамоўленасцяў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь зацікаўлена і ў індыйскіх інвестыцыях, і асабліва — ва ўзвядзенні беларуска-індыйскага навукова-тэхналагічнага парка. Кіраўнік дзяржавы заявіў, што наша краіна гатова забяспечыць магчымасці і неабходныя прэферэнцыі для яго стварэння на самых выгадных умовах. «Індыя — магутная дзяржава, значыць, у вас ёсць інтарэс працаваць у Еўропе, на постсавецкай прасторы. Мы таксама зацікаўлены ствараць у вас сумесныя прадпрыемствы для вытворчасці тых тавараў, якія крытычна важныя для вашай эканомікі: аўтамабіле-, трактара- і сельгасмашынабудаванне. Вы добра ведаеце нашы магчымасці. Таму тут у нас павінен быць рух насустрач», — сказаў беларускі лідар.

Пасол Індыі, у сваю чаргу, падкрэсліў, што паміж нашымі краінамі няма раздражняльнікаў і мы падтрымліваем блізкі кантакт у міжнародных арганізацыях. «Мы ўдзячны Беларусі за падтрымку індыйскіх кандыдатур на розных міжнародных пляцоўках», — дадаў Панкадж Саксена.

Панкадж САКСЕНА, Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Індыя ў Рэспубліцы Беларусь:

— За той перыяд, што я кіраваў індыйскім пасольствам, мы дасягнулі двух найважнейшых вынікаў. Першае — гэта тое, што адбыўся трэці дзяржаўны візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Індыю. Другое — святкаванне 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі краінамі. Я павінен сказаць, што той факт, што візіт Прэзідэнта Беларусі ў Індыю адбыўся менавіта ў год адзначэння гэтай даты, надаў дадатковыя пазітыўныя адценні нашым кантактам, новы кірунак намаганням па дыверсіфікацыі і пашырэнні двухбаковых адносін. Падобныя перагаворы на найвышэйшым узроўні, рэгулярны абмен візітамі надзвычай важныя для пашырэння беларуска-індыйскага супрацоўніцтва.

ПЕРСПЕКТЫВА НЕ НА АДЗІН МІЛЬЁН

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам кіраўніка спраў Прэзідэнта Віктара Шэймана. У ходзе сустрэчы размова ішла аб перспектывах пашырэння эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі з краінамі афрыканскага кантынента. Прэзідэнт праінфармаваны аб выніках візіту Віктара Шэймана ў Рэспубліку Зімбабвэ, які адбыўся па даручэнні кіраўніка дзяржавы.

У прыватнасці, адбыліся перагаворы з прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагва, а таксама першым віцэ-прэзідэнтам, міністрамі розных галін краіны, старшынёй Рэзервовага банка. У ходзе перагавораў былі дасягнуты дамоўленасці і падпісаны кантракты на суму амаль $58 млн, у тым ліку па пастаўках беларускіх трактароў на $43 млн і тэхнікі для лясной гаспадаркі на $15 млн. Размова ішла таксама аб стварэнні зборачных вытворчасцяў беларускай сельскагаспадарчай і горназдабываючай тэхнікі. Акрамя таго, Зімбабвэ зацікаўлена ў закупцы беларускіх угнаенняў, цяпер рыхтуецца кантракт на суму амаль $10 млн.

Дасягнуты дамоўленасці па развіцці супрацоўніцтва і па многіх іншых напрамках: стварэнні сумесных прадпрыемстваў па перапрацоўцы мяса і малака, для рэалізацыі праектаў у жыллёвым, прамысловым і дарожным будаўніцтве, у галіне транспарту, ва ўзвядзенні лагістычнага комплексу, пераняцці беларускага вопыту па рэкультывацыі зямель і ірыгацыі засушлівых раёнаў. Прапрацоўваюцца магчымасці двухбаковага супрацоўніцтва ў галіне электраэнергетыкі.

Прэзідэнт быў таксама праінфармаваны аб перспектывах стварэння прадпрыемства па здабычы карысных выкапняў. У прыватнасці, беларускія спецыялісты могуць быць задзейнічаны ў геолагаразведцы, здабычы нафты і газу ў гэтай багатай на рэсурсы краіне.

■ Ва ўрадзе

НА БРЭСТЧЫНЕ ПАЧНУЦЬ СЕЯЦЬ УЖО НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ

Пасяўная кампанія можа пачацца ў Брэсцкай вобласці ўжо праз тыдзень. Аб гэтым падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў заявіў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ. Паводле яго слоў, сёлета перад аграрыямі стаіць задача павялічыць узровень вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі на 4,8 % у параўнанні з вынікамі 2017 года.

«У тым ліку гэта датычыцца прадукцыі раслінаводства — на 5 %, жывёлагадоўлі — на 4,6 %. Асноўная задача, якая зараз стаіць перад Мінсельгасхарчам, аблвыканкамамі, райвыканкамамі, — правядзенне веснавой пасяўной на высокім арганізацыйным і тэхналагічным узроўнях», — растлумачыў Андрэй Кабякоў. Пры гэтым кіраўнік урада адзначыў, што рэгіёнам краіны да 25 сакавіка неабходна забяспечыць гатоўнасць тэхнікі на ўзроўні не ніжэй за 95 %.

На правядзенне веснавых палявых работ прадугледжаны льготныя крэдыты банкаў на суму 320 млн рублёў. Пры гэтым Андрэй Кабякоў звярнуў увагу, што дадзеныя крэдыты будуць выдзяляцца толькі ў тым выпадку, калі будуць вернутыя рэсурсы, выдадзеныя ў 2017 годзе і папярэдніх гадах на адпаведныя мэты. У мясцовых бюджэтах на 2018 год прадугледжаны сродкі, у тым ліку субсідыі, уключаючы выплату надбавак за рэалізаваную прадукцыю, у суме 191 млн рублёў.

Таксама ён адзначыў, што калі аблвыканкамы, Мінсельгасхарч, канцэрны «Белдзяржхарчпрам» і «Беллегпрам» аператыўна спрацуюць па падборы плацежаздольных арганізацый-нарыхтоўшчыкаў на выкуп дзяржзаказу, то будзе выдзелены аванс на палявыя работы ў памеры 180 млн рублёў. Адпаведны праект указа будзе накіраваны на разгляд кіраўніка дзяржавы. Таксама ўрад ужо накіраваў на разгляд Прэзідэнта праект распараджэння па падтрымцы ў выглядзе перадачы з дзяржрэзерву паліва ў аб'ёме 50 тысяч тон, якое вярталі сельгасарганізацыі.

Вырашаць пытанне па пастаўках малака

Беларусь плануе ўрэгуляваць пытанне з пастаўкамі малака праз прыняцце дарожнай карты. Пра гэта журналістам у Савеце Міністраў заявіў **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід ЗАЯЦ.** Плануецца, што новая дарожная карта будзе лепш улічваць інтарэсы дзвюх краін.

Ён таксама адзначыў, што ў найбліжэйшы час у Маскве адбудзецца сустрэча на ўзроўні намеснікаў прэм'ер-міністраў для абмеркавання гэтага пытання. «Упэўнены, што разгляд і прыняцце гэтай дарожнай карты здымуць забарону паставак нашых прадпрыемстваў на расійскі рынак», — адзначыў Леанід Заяц. Таксама, па яго словах, сыравіна, якая паступае з беларускіх гаспадарак на малочныя прадпрыемствы, праходзіць праз неабходны кантроль. Той жа самы кантроль ёсць і ў працэсе перапрацоўкі. Пры адгрузцы гатовай прадукцыі кожная партыя даследуецца ў лабараторыях.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■

Памяць, якой ганарымся

Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане адзначыў 25-годдзе

Урачысты сход адбыўся ў Рэспубліканскім палацы культуры ветэранаў. Віншаванне арганізацыі ад Прэзідэнта зачытаў начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Ільясевіч.

Сімвалічна, што 25-годдзе аб'яднанне адзначае ў год векавога юбілею Узброеных Сіл Беларусі. Значную ролю саюза ветэранаў у жыцці грамадства адзначыў міністр абароны Андрэй Раўкоў.

«Створанае ў 1993 годзе ў найскладанейшы перыяд, калі вырашалася пытанне будучыні Беларусі, аб'яднанне воінаў-інтэрнацыяналістаў унесла значны ўклад у захаванне і ўмацаванне беларускай дзяржаўнасці, падтрымаўшы выбар беларускага народа ў 1994 годзе і далей. Саюз ветэранаў вайны ў Афганістане захаваў згуртаванасць сваіх радоў і сёння актыўна ўдзельнічае ва ўмацаванні краіны і ваенна-патрыятычным выхаванні грамадзян. У Беларусі афіцыйна прызнана высокая сацыяльная роля подзвігу воінаў-інтэрнацыяналістаў. Нікому не ўдасца перапісаць гісторыю, прынізіць ролю тых, хто першым прыняў выклік сіл, якія сёння называюцца міжнародным тэрарызмам», — сказаў Андрэй Раўкоў.

Прывітальныя словы ветэранам выказалі прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства адукацыі, Генеральнай пракуратуры. Старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Валерый Гайдукевіч адзначыў, што сёння задачамі аб'яднання з'яўляецца патрыятычнае выхаванне моладзі і аказанне дапамогі тым, хто знаходзіцца ў цяжкіх жыццёвых умовах.

«Дарогамі Афганістана прайшлі больш за 30 тысяч нашых суайчыннікаў. Больш за 770 з іх не вярнуліся з той вайны. Мы свята захоўваем у сэрцах памяць пра нашых баявых таварышаў», — падкрэсліў Валерый Гайдукевіч.

Марыя ДАДАЛКА.

БДУ «замацаваўся» ў Турцыі

Інфармацыйна-адукацыйны цэнтр БДУ адкрыўся ў Анкары. Ён дзейнічае на базе офіса адукацыйнай кампаніі «Атлас» (Atlas private educational services), а яго работу з беларускага боку каардынуе факультэт даўніверсітэцкай адукацыі БДУ.

Мяркуецца, што функцыянаванне цэнтра ўмацуе адукацыйныя і культурныя сувязі паміж установамі вышэйшай адукацыі Беларусі і Турцыі, а таксама значна спросціць абмен інфармацыяй. У прыватнасці, цэнтр будзе аказваць кансультацыйныя паслугі па паступленні ў Белдзяржуніверсітэт, а таксама ў іншыя беларускія ВНУ. У рамках візіту ў Турцыю дэлегацыя БДУ прыняла ўдзел у міжнароднай адукацыйнай выстаўцы «A2 International Education Fairs of Turkey». Яна з'яўляецца адным з найважнейшых мерапрыемстваў у цэнтральна-азіяцкім рэгіёне па рэкламе і прасоўванні адукацыйных паслуг на рынку Азіі і Блізкага Усходу.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні намесніку прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Міхаілу Іванавічу Русаму ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БАЦЬКІ.

Калектыў Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта глыбока смуткуе з прычыны смерці былога дацэнта кафедры перыядычнага друку, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны ДУБОВІКА Вадзіма Іванавіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о повторном проведении открытого аукциона по продаже объектов недвижимости в Пинском районе

Лот № 1	
Наименование объекта	Капитальное строение (здание специализированное животноводства – свиноферма) (130/С-3217)
Продавец объекта	ОАО «Новодворское-агро»
Организатор торгов	ОАО «Новодворское-агро»
Общая площадь здания	837,2 кв. м
Начальная цена продажи с учетом НДС	20880,00 руб.
Сумма задатка (бел. руб.)	1 044,00 руб.
Площадь земельного участка (га) с кадастровым № 125487502601000017	0,1014 га
Характеристика объекта	Одноэтажное сооружение, ограждение отсутствует, сети электроосвещения и водоснабжения отсутствуют, имеются повреждения крыши, окна отсутствуют
Условия оплаты	По договоренности победителя аукциона с собственником имущества. Обязательным условием в договоре купли-продажи является обязанность Покупателя возместить расходы Продавца, связанные с изготовлением последним всех правоустанавливающих документов, а также затраты по проведению рыночной оценки предмета аукциона
Условия аукциона	Без условий

Повторный аукцион состоится 28.03.2018 года в 10:00 по адресу: 225735, Брестская обл., Пинский район, д. Чухово, ул. Полесская, 1а.

Дополнительная информация опубликована в газете «ЗВЯЗДА» № 25 от 06.02.2018.

УНН 290481563

■ Будзь у курсе

ПРАЕЗД СТОЯЧЫ І ЛАЯЛЬНАСЦЬ ДА ЖЫВЁЛ

Унесены змяненні ў Правілы перавозак пасажыраў, багажу і грузабагажу па чыгунцы

Адпаведная пастанова Саўміна ўступіць у законную сілу ў найбліжэйшы час пасля яго афіцыйнага апублікавання, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Асноўныя змяненні, прадугледжаныя дакументам, датычацца правілаў перавозак ручной паклажы, жывёл, парадку пераафармлення праязных дакументаў і іх вяртання.

У частцы перавозкі ручной паклажы выключаецца пункт, які раней устанаўліваў розныя патрабаванні да габарытных памераў прадметаў, якія перавозяцца бясплатна ў якасці ручной паклажы. Напрыклад, калі раней быў устаноўлены пэўны пералік прадметаў і іх памеры (лыжы з палкамі, снаўборды, саджанцы раслін, веласіпеды і інш.), то новым дакументам выключаны абмежаванні па пераліку прадметаў. Галоўнае — захаванне габарытных нормаў: сума трох вымярэнняў не павінна перавышаць 200 сантыметраў, а вага павінна быць не больш за 36 кілаграмаў.

У частцы перавозкі жывёл таксама прадугледжаны найбольш лаяльныя ўмовы. Новы дакумент выключае неабходнасць дадатковай аплаты пры перавозцы дробных жывёл (калі яна ажыццяўляецца ў лік нормы ручной паклажы на месцах, прызначаных для яе размяшчэння).

Што датычыцца парадку пераафармлення праязных дакументаў, пастановай прадугледжана кампенсацыя пасажыру розніцы кошту першапачатковага і новааформленага праязнога дакумента ў выпадку змяншэння кошту паездкі пры пераафармленні праязнога дакумента на іншы цягнік, які адыходзіць раней.

Змены датычацца і вяртання кошту праезду ў выпадках магчымых нестандартных сітуацый. Так, пашыраецца і ўдакладняецца пералік выпадкаў, пры якіх пасажыр пры вяртанні нявыкарыстанага праязнога дакумента (білета) на цягнік з нумаравanымі месцамі мае права атрымаць у білетнай касе агульны кошт праезду. Напрыклад, пры адсутнасці месца ў цягніку згодна з набытым праязным дакументам (білетам) і пры згодзе пасажыра на выдзяленне перавозчыкам іншага месца ў вагоне ніжэйшага тыпу і (або) класа пасажыру кампенсуецца розніца ў кошце праезду, а пры выдзяленні месца ў вагоне больш высокага тыпу і (або) класа дадатковая аплата не спаганяецца.

Таксама дакументам вызначана, што пры затрымцы адпраўлення цягніка больш чым на адну гадзіну са станцыі пасадкі пасажыра, які накіроўваецца з перасадкай на ўзгодненыя цягнікі (інтэрвал паміж якімі складае больш за адну гадзіну), ён можа вярнуць на першапачатковай станцыі адпраўлення праязныя дакументы (білеты), набытыя на ўвесь маршрут руху.

У частцы праезду пасажыраў з дзецьмі ва ўзросце да 10 гадоў прадугледжана зняцце абмежаванняў па выдзяленні ніжніх месцаў толькі бацькам з дзецьмі. Цяпер ніжнія месцы могуць выдзяляцца любому даросламу, які суправаджае дзяцей да 10 гадоў.

Важна адзначыць, што пастановай закладзены асновы, якія дазваляюць перавозчыку ўдасканальваць формы праезду пасажыраў і тэхналогіі ў частцы афармлення праязных дакументаў.

Акрамя гэтага, дакумент дапоўнены нормай, якая рэгламентуе магчымасць упаўнаважаным асобам пры выкананні службовых абавязкаў прымяняць тэхнічныя сродкі, якія ажыццяўляюць гука- і відэазапіс.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Вясна ідзе

Жаўрукі ўжо дома

Напрыканцы першага тыдня сакавіка ў Гродзенскім раёне сябры АПБ бачылі першых палявых жаўрукоў

Палявыя жаўрукі заўсёды прылятаюць рана, яны першыя прадвеснікі вясны. Бывае, ужо ў лютым мы заўважаем гэтых птушачак, як было ў папярэднія два гады. Сёлета вясна ў нас позняя. У пачатку сакавіка — маразы і снег. Але палявыя жаўрукі ўсё адно не марудзілі, а вярнуліся на Радзіму як найхутчэй. Чаму яны так спяшаюцца?

— Першымі з выраю вяртаюцца самцы палявых жаўрукоў, — тлумачыць **дырэктар грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ.** — Яны хочуць паспець заняць найлепшыя месцы для гнездавання. Раней за ўсіх прылятаюць самыя моцныя, у якіх найбольш шанцаў займець патомства. Хутка мы пачуем у небе іх песні.

Дарэчы, маразоў яны не баяцца і корм сабе знаходзяць: жывяцца насеннем, стрэсеным на дол і снег. Рагатыя жаўрукі і жаўрукі-смецюхі нават адзначаліся ў нас на зімоўцы. Сярод іншых незвычайных відаў, якія заставаліся ў нас на зіму, можна адзначыць канаплянак, сняжурак, шэрых і белалобых гусей ды гуменнікаў.

Калі прылятаюць іншыя?

Вось пяць птушак — вястунняў вясны, якіх адносна лёгка пазнаць: белы бусел, вясковая ластаўка, чорны свіргуль, звычайная зязюля і шчурка-пчалаедка.

Недзе ў другім тыдні сакавіка вяртаюцца ў краіну першыя буслы, у першай палове красавіка — вясковыя ластаўкі і зязюлі, у маі — свіргулі і шчуркі-пчалаедкі. Навошта сустракаць птушак?

— Назіраць птушак, якія толькі-толькі вяртаюцца да нас з далёкіх краёў, — прыемна і захапляльна, выдатная магчымасць адчуць прыродныя змены, адзначыць надыход сапраўднай вясны. Усе гэтыя птушкі «Жывой вясны» шырока распаўсюджаныя, акрамя шчуркі-пчалаедкі. Пабачыць яе будзе сапраўднай удачай. Паведамляйце нам, калі іх убачыце, — запрашае **кіраўнік аддзела развіцця АПБ, каардынатар кампаніі «Жывая вясна» па Беларусі Карына САЛАВЕЙ.**

А яшчэ ў межах кампаніі адбудуцца конкурсы фотаздымкаў і слоганаў (падрабязней глядзіце на ptushki.org), пройдуць птушыныя экскурсіі, прэзентацыі, святы і гульні ў школах.

Даведка: Кампанія «Жывая вясна» пачалася ў 2006 годзе як еўрапейскі праект. Потым далучылася і Сярэдняя Азія. З 2010 года «Жывая вясна» пайшла ў Афрыку: з верасня жыхары гэтага кантынента назіраюць, як абраныя пяць відаў птушак ляцяць на зімоўку ў іх краіны. Летась у больш чым 700 падзеях кампаніі паўдзельнічала больш за 150 000 чалавек у краінах Еўропы, Цэнтральнай Азіі і Афрыкі. Дзякуючы актыўнаму ўдзелу аматараў і прафесіяналаў наша краіна апынулася на 3-м месцы сярод 55 краін-удзельніц.

Сяргей КУРКАЧ

■ Здарэнне

ВЫПАДКІ НА МЯЖЫ

З наступленнем вясны актывізаваліся памежныя кантрабандысты.

У Маларыцкім раёне вартавыя мяжы спынілі дзве легкавыя машыны, якія ішлі з Украіны на нашу тэрыторыю. Не проста спынілі — давялося нават страляць з аўтамата ўгару. Аказалася, кіроўцы нездарма ўцякалі. Машыны былі літаральна забітыя... цялячымі тушамі. Мужчыны спрабавалі правезці 1630 кілаграмаў мяса на суму больш за 4 тысячы рублёў. Тавар і транспартныя сродкі затрыманыя.

А днямі над пагранічнай заставай «Знаменка» ў Брэсцкім раёне быў заўважаны беспілотнік. Калі лятальны апарат пасадзілі, убачылі, што да яго прывязаны груз — упакоўка з 300 пачкамі цыгарэт. Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Брэсцкай пагранічнай групы Сяргей ДЗМІТРЫЕЎ,** асобы, якія спрабавалі перакінуць кантрабанду паветрам, установлены. Яны будуць прыцягнуты да адказнасці па трох артыкулах, а гэта азначае буйныя штрафы. І самым бяскрыўдным на гэтым фоне выглядае парушальнік, які ішоў пехатою з Украіны без усялякай кантрабанды. 44-гадовы мужчына ішоў 7 сакавіка ў Столінскі раён, каб павіншаваць былую жонку са святамі. Але ж, нягледзячы на свята, грамадзянін атрымаў два пратаколы: за незаконнае перасячэнне мяжы і парушэнне правілаў знаходжання.

Святлана ЯСКЕВІЧ

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

КІРАЎНІКОМ ЦРУ ЎПЕРШЫНЮ СТАНЕ ЖАНЧЫНА

Дырэктарам Цэнтральнага разведвальнага ўпраўлення ЗША ўпершыню ў гісторыі стане жанчына — ведамства ўзначаліць Джына Хаспел. Пра гэта амерыканскі прэзідэнт Дональд Трамп напісаў на сваёй старонцы ў «Твітэры». У лютым 2017-га Хаспел заняла пасаду намесніка кіраўніка ЦРУ. На новай пасадзе яна зменіць Майка Пампея, якога Трамп прызначыў дзяржсакратаром замест Рэкса Тылерсана. Абедзве прапанаваныя кандыдатуры павінен будзе зацвердзіць Канграс. Хаспел служыла ў ЦРУ з 1985 года. Яна ў тым ліку кіравала тайнай турмой ведамства ў Тайландзе, пісала The New York Times.

ПРАВЫЯ ПЕРАМАГЛІ НА ВЫБАРАХ У КАЛУМБІІ

Правыя партыі, якія выступаюць супраць мірнага пагаднення з Рэвалюцыйнымі ўзброенымі сіламі Калумбіі (ФАРК), перамаглі на парламенцкіх выбарах у Калумбіі.

Першы вынік паказаў «Дэмакратычны цэнтр» пад кіраўніцтвам Івана Дуке. Назіральнікі не выключаюць, што перамога правых можа паставіць пад пагрозу падпісанае ў 2016 годзе мірнае пагадненне з ФАРК, дзякуючы якому гэтыя выбары — упершыню за многія гады — прайшлі спакойна па ўсёй краіне і ў якіх, таксама першы раз, удзельнічалі кандыдаты ад «Агульнай альтэрнатыўнай рэвалюцыйнай сілы». Праўда, партыя былых паўстанцаў набрала ўсяго 0,35 % галасоў у сенаце і 0,22 % у ніжняй палаце.

ЕС АБМЯРКУЕ АДНОСІНЫ З ТУРЦЫЯЙ

Кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў краін — членаў Еўрасаюза ў ходзе саміту 22—23 сакавіка ў Бруселі абмяркуюць стан адносін з Турцыяй, заявіла прадстаўнік балгарскага старшынства ў Савеце ЕС Моніка Панаётава. Як вядома, адносіны ЕС і Турцыі пагоршыліся пасля спробы ўзброенага пераваротy ў краіне ў 2016 годзе: Еўрасаюз раскрытыкаваў рэакцыю турэцкіх улад, масавыя арышты і іншыя меры Анкары і прыпыніў падрыхтоўку перагаворнага дасье аб уступленні Турцыі ў ЕС.

КІТАЙ АБВЯСЦІЎ АБ ПАЧАТКУ РАСПРАЦОВАК 6G

Навукоўцы Кітая распачалі распрацоўку стандарту сувязі шостага пакалення. Пра гэта на палях першай сесіі Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў 13-га склікання паведаміў міністр прамысловасці і інфарматызацыі Мяа Вэй. «Развіццё «інтэрнэту рэчаў» павінна ажыццяўляцца адначасова з пашырэннем магчымасцяў тэхналогій мабільнай сувязі», — сказаў ён. Па словах міністра, хуткі тэхналагічны рост забяспечвае не толькі магчымасць зносін паміж людзьмі з дапамогай мабільнай сувязі, але і ўзаемадзеянне паміж чалавекам і машынай, а таксама паміж машынамі непасрэдна. «Гэта будучыня чалавецтва, — заўважыў Мяа Вэй. — Жаданне быць падрыхтаваным да яго — адна з прычын актыўных работ у галіне мабільнай сувязі».

■ Ну і ну!

Замежнікі адмовіліся разлічвацца...

У сталіцы затрымалі грамадзяніна Польшчы, які спрабаваў абрабаваць таксіста і ўкрасці яго машыну.

Ранкам у міліцыю паступіла паведамленне ад кіроўцы таксі пра тое, што тры пасажыры на вуліцы Жукоўскага не аплачваюць паслугі і спрабуюць сагнаць аўтамабіль. На месца выбылі супрацоўнікі Кастрычніцкага РУУС, зламыснікаў — трох грамадзян Польшчы — затрымалі.

Высветлілася, што іншаземцы прыехалі ў Мінск для адкрыцця даччынай фірмы яшчэ ў лютым. У адзін з дзён, адпачываючы ў бары, ужывалі алкагольныя напоі. Пасля кампанія вырашыла вярнуцца дадому на таксі. Калі прыехалі па патрэбным адрасе, палякі за паслугі цалкам не расплаціліся. З-за гэтага ўзнік канфлікт з кіроўцам. 24-гадовы грамадзянін Польшчы забраў у яго кошт аплачанай паездкі, 10 рублёў і металічны тэрмас. Спужаўшыся, кіроўца таксі выбег з машыны і выклікаў міліцыю. Усіх траіх затрымалі і даставілі ў міліцыю для далейшага разбору. Па інфармацыі Кастрычніцкага РУУС г. Мінска, галоўны фігурант справы быў моцна п'яны, матывы свайго ўчынку растлумачыць не мог. Зараз ён знаходзіцца ў ІЧУ, у адносінах да яго заведзены крымінальныя справы за грабеж і згон транспартнага сродку.

Сяргей РАСОЛЬКА

«БЕЛЛІТ: МАБІЛЬНЫ ГІД»: ПРА БЕЛАРУСКУЮ ЛІТАРАТУРУ — НЯСУМНА!

Бясстрашная авантурная лекарка і вандроўніца Саламея Пільштынова. Уладная і разумная Бабароза, матрыярх адной мінскай сям'і. Студэнтка шведскай школы Алена. Хуліганка, захопніца замкаў, жорсткая, але справядлівая Босая. Што аб'ядноўвае ўсіх гэтых літаратурных гераінь?

Юлія ЦІМАФЕЕВА, літаратарка і перакладчыца, упэўнена, што ніводная з іх проста не можа пакінуць чытача абыякавым. Яны адважныя, шчырыя, адкрытыя, непрадказальныя і супярэчлівыя, ты можаш з імі не пагаджацца, спрачацца, але аповед пра іх усё роўна цябе захоплівае. «Я быў старэйшы за яе амаль на тры гады, а яна была разумнейшая за мяне на тры тысячы прачытаных кніг, на трыста пабачаных фільмаў, на трыццаць незнаёмых мне слоў...», — так апісвае галоўны герой рамана Альгерда Бахарэвіча «Белая муха, забойца мужчын» сваю сустрэчу ў далёкім юнацтве з жанчынай па мянушцы «Босая». Хто яны, жанчыны, што кінулі выклік Краіне замкаў і патрыярхальнаму грамадству, і ці можа быць хоць нейкі хэпі-энд у гэтай гісторыі, Юлія Цімафеева прапаноўвае даведацца нам самім. У перадсвяточныя дні ў рамках праекта «БелЛіт: мабільны гід» адбылася першая публічная лекцыя, прысвечаная прыгожай палове чалавецтва.

Юлія ЦІМАФЕЕВА: «Хацелася б, каб жанчыны пісалі больш пра сябе і не тое, што ад іх чакаюць, а тое, што яны самі адчуваюць».

— Мне цікавая жанчына ў літаратуры, я сама паэтка, і ў нейкай ступені займаюся прасоўваннем бачнасці жанчын у літаратуры, — прызналася Юлія. — Хацелася б, каб жанчыны пісалі больш пра сябе і не тое, што ад іх чакаюць, а тое, што яны самі адчуваюць.

Праект «БелЛіт»: мабільны гід» ладзіцца пры падтрымцы Мабільнай бібліятэкі МТС.

— Для нас гэта выдатная нагода згуртаваць людзей, неабыякавых да беларускай літаратуры і роднага слова, — падкрэслівае **кіраўнік групы па сувязях з грамадскасцю кампаніі МТС Вольга ТКАЧЭНКА.** — «БелЛіт» — менавіта так мы называлі прадмет «беларуская літаратура» ў школе. Як мы яе ўспрымалі? З якімі эмоцыямі? У кожнага, безумоўна, будзе свой адказ на гэтае пытанне. Для кагосьці беларуская літаратура «скончылася» разам са школьнай праграмай. А нам бы хацелася абудзіць жаданне працягнуць гэтае знаёмства, адкрыць для сябе сучасную беларускую літаратуру, новых аўтараў і новыя творы. Таму мы будзем рады бачыць на лекцыях як маладых людзей, так і сталых чытачоў, якія жадаюць заставацца ў трэндзе. Падчас літаратурных сустрэч можна будзе не толькі паслухаць прафесіяналаў, задаць ім пытанні, але і падзяліцца ўласнымі думкамі наконт любімых твораў, аўтараў і прыемна правесці час у сяброўскай атмасферы аднадумцаў.

Усяго запланавана шэсць лекцый. Пагружэнне ў свет беларускай літаратуры будзе адбывацца пры ўдзеле пісьменнікаў, выкладчыкаў і медыйных асоб. І першае пагружэнне прайшло надзвычай паспяхова — пры поўнай зале. Арганізатары нават хваляваліся, ці зможа яна змясціць усіх ахвотных. У сваёй лекцыі Юлія Цімафеева распавяла пра мемуары Саламеі Пільштыновай «Авантуры майго жыцця», творы Паўла Касцюкевіча «План Бабарозы», Альгерда Бахарэвіча «Белая муха, забойца мужчын», Анкі Упалы «На заснежаны востраў» і вершы паэткі Вальжыны Морт.

— Хто такая Саламея Пільштынова і чым яна мусіць нас здзівіць? — інтрыгавала Юлія. — Гэта было фенаменальнае жыццё для жанчыны ў XVIII стагоддзі. Наша гераіня нарадзілася на Навагрудчыне ў сям'і збяднелага шляхціча. У 14 гадоў бацькі аддалі яе замуж за нямецкага лекара, і маладая сям'я з'ехала ў Стамбул, дзе ў мужа была лячэбная практыка. Саламея прыглядалася да таго, што ён рабіў, і ў 15—16 гадоў яна ўжо пачала сама лячыць, а ў 17 гадоў займела ўласную практыку. Праўда, не заўсёды лячэнне завяршалася паспяхова, таму лекарцы даводзілася хавацца. «Але сэрца Бог даў мне мужнае, а не палахлівае», — казала яна сама пра сябе.

Саламея наведала шматлікія гарады і краіны, яе прымалі пры двары турэцкага султана Махмуда I, расійскай імператрыцы Ганны Іаанаўны, аўстрыйскага імператара Карла VI, князёў Радзівілаў і Патоцкіх. Усё яе жыццё было поўнае нечаканасцяў і авантур, але прыродны розум, смеласць і знаходлівасць заўсёды дапамагалі ёй выходзіць з самых неверагодных і небяспечных сітуацый.

— Я лічу сябе падрыхтаваным чытачом, паколькі навучалася ў ліцэі на філалагічным профілі, і, напрыклад, верш Вальжыны Морт «Беларуская мова», пра які сёння ішла гаворка, ведаю на памяць. Добра «знаёмая» я і з Саламеяй Пільштыновай. Але ўпэўнена, што сюды можа прыйсці любы ахвотны, бо форма падачы літаратурнага матэрыялу — вельмі сучасная, — падзялілася сваімі ўражаннямі пасля лекцыі **студэнтка першага курса філалагічнага факультэта БДУ Міхаліна БУРВІНА.**

Наступная лекцыя «Беларуская літаратура: «вялікая» ці «малая»?» адбудзецца 21 сакавіка. Паразважаць на тэму, якое месца займае беларуская літаратура ў сусветнай, як яе бачаць за мяжой і ці карэктна наогул падзяляць літаратуру на «малую» і «вялікую», запрашае пісьменнік Альгерд БАХАРЭВІЧ. *Зарэгістравацца на лекцыі і падпісацца на e-mail-рассылку можна на сайце праекта http://gidbellit.by/.* Усе заняткі для наведвальнікаў бясплатныя. Месца правядзення — бізнес-клуб Imaguru (вул. Фабрыцыуса, 4), пачатак у 19.00.

Кожны слухач лекцый атрымае залікоўку, дзе будуць адзначацца заняткі, якія ён наведае, і тэматычныя тэсты, якія пройдзе на сайце CityDog. Лепшыя студэнты ў дадатак да новых ведаў і яркіх эмоцый атрымаюць і «чырвоныя» дыпломы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

УНП 800013732

Расклад наступных лекцый:

4 красавіка

«Біблія Скарыны: паспяховы стартап XVI стагоддзя»

Алесь СУША, культуролаг, скарыназнаўца, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці.

18 красавіка

«Невядомая беларуская літаратура: пра што вам не казалі ў школе»

Ганна СЕВЯРЫНЕЦ, настаўніца гімназіі, пісьменніца, даследчыца беларускай літаратуры.

4 мая

«Воркшоп: як правільна чытаць і разумець паэзію»

Вальжына МОРТ, паэтка, выкладчыца крэатыўнага пісьма ў Карнэльскім універсітэце (ЗША).

23 мая

Дыскусія «Зала славы беларускай літаратуры: хто нашы геніі?»

Ганна БУТЫРЧЫК, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчыца кафедры замежнай літаратуры БДУ.

Марына КАЗЛОЎСКАЯ, перакладчыца, кандыдат філалагічных навук, загадчыца кафедры беларускай мовы і літаратуры Ліцэя БДУ.

Шахцёрская сталіца стане тэатральнай

У Салігорску трэці раз пройдзе адкрыты фестываль — форум тэатральнага мастацтва «ТЭАТРОН line — 2018».

З 22 па 25 сакавіка самі тэатры прыедуць у шахцёрскую сталіцу. І не толькі з Беларусі, але і з іншых краін. Цяпер ідзе прыём заявак ад удзельнікаў: дзіцячых тэатраў, дзе акцёрам па 10—16 гадоў, студэнцкіх і маладзёжных аматарскіх тэатраў (узрост удзельнікаў да 35 гадоў). На форуме плануецца правядзенне дзвюх асобных праграм: «ТЭАТРОН line для малых» — спектаклі і інтэрактыўныя мерапрыемствы для дзяцей ад 3 да 7 гадоў, а таксама навінка — «ТЭАТРОН over a cup of tea», якая прадугледжвае спектаклі і інтэрактыўныя праграмы па творах англійскіх пісьменнікаў.

Арганізатары фэсту — Салігорская дзіцячая школа мастацтваў і яе сямейны тэатр «Чамадан», кафедра рэжысуры і цэнтр эксперыментальнай рэжысуры «Адкрытая пляцоўка» Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Цэнтр беларускай драматургіі Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ВОГНЕННЫЯ «БЫЧКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

27 верасня 2017 года адзначылася тым, што ў Мінску згарэлі адразу два балконы. Удзень запалалі рэчы на балконе двухпакаёвай кватэры, размешчанай на першым паверсе ў доме па вуліцы Кунцаўшчына. На шчасце, тым усё і скончылася — далей балкона полымя прайсці не паспела, бо пільныя мінакі вельмі хутка набралі нумар «101» — гаспадароў дома не было. А вось ужо ўвечары яшчэ адзін недакурак запаліў рэчы на балконе восьмага паверха ў доме на процілеглым канцы сталіцы — у Зялёным Лузе. Як і ў папярэднім выпадку, дома таксама не было нікога. Але тут ужо агонь заўважылі значна пазней. У выніку ён пашкодзіў аконную раму, закурадыміў пакой і яшчэ рэчы, якія знаходзіліся на балконе кватэры паверхам вышэй.

Ды і драўляная балконная рама не заўжды з'яўляецца надзейным ахоўнікам ад непагашаных недакуркаў. Паказальны выпадак здарыўся напрыканцы лютага ў Мінску, калі ратавальнікі тушылі раму ў чатырохпавярховым доме на завулку Казлова.

Недакурак вельмі доўга тлее. І без старонняй дапамогі хутка ён не згасне. А паколькі ён лёгкі, то прадвызначыць, па якой траекторыі паляціць, проста немагчыма. Скажам, калі яго выкінулі з акна дзявятага паверха, то ён вельмі проста можа стаць непрыемным «сюрпрызам» для жыхароў другога ці трэцяга. Або ўвогуле прыляцець па сыходнай з суседняга пад'езда.

Зрэшты, небяспека ўзгарання пагражае і самім аматарам пакурыць на балконе. Пакінутая запальнічка пад уздзеяннем прамых прамянёў сонца можа разагрэцца да высокай тэмпературы і дэфармавацца або ўвогуле разарвацца.

Пажар на балконе небяспечны тым, што часта гэтая частка кватэры ператворана ў сховішча непатрэбных рэчаў. Знайсці своечасова вогненнага «госця», які, напрыклад, заваліўся на кіпу макулатуры паміж старым рондалем і роварам, вельмі цяжка. Асабліва калі на вуліцы цёпла і рама ўвесь дзень расчынена насцеж. А ў дамах старой пабудовы і дагэтуль ёсць балконы, дзе аконных рам няма ўвогуле. Таму ўмовы для пажару там створаны проста ідэальныя. Гаспадар кватэры рызыкуе заўважыць полымя толькі тады, калі агонь ужо пачне пранікаць праз аконную раму ў кватэру. І добра яшчэ, калі дома нехта знаходзіцца і паспее своечасова прыняць меры. А калі не? Затушыць пажар таксама не заўжды лёгка — не сакрэт, што многія двары ў сталіцы «забіты» аўтамабілямі літаральна «пад завязку». А аўталесвіцы неяк жа трэба падабрацца да патрэбнага балкона.

Калі ж з-за пажару была знішчана маёмасць на суму, большую за тысячу базавых, то да курыльшчыка будзе ўжыты артыкул Крымінальнага кодэкса. Ну і, канешне ж, давядзецца ў поўным аб'ёме кампенсаваць нанесены ўрон.

www.tut.by

— Знайсці вінаўніка можна не заўсёды, — працягвае Вольга Мельчанка. — Курыльшчыкаў у нас вельмі шмат, і прыцягнуць іх да адказнасці перад узнікненнем надзвычайнай сітуацыі немагчыма з-за таго, што курэнне ў нас не забаронена. Да таго ж агонь часта знішчае саму крыніцу ўзгарання, і судовыя эксперты не маюць магчымасці правесці патрэбнае даследаванне. Але калі недакурак усё ж нейкім чынам захаваўся, то вылічыць «падпальшчыка» цяжкасці не складае. Дапамагаюць і сведчанні відавочцаў.

Напрыклад, калі некалькі гадоў таму згарэў балкон па вуліцы Убарэвіча, то вінаўніцу пажару знайшлі даволі хутка. Ёй аказалася трыццацігадовая жанчына, якая кінула недакурак. У такім выпадку штраф будзе не толькі за выкідванне смецця, але і за неасцярожнае абыходжанне з агнём. На сёння гэтая сума складае ад 30 да 50 базавых велічынь. Калі ж з-за пажару была знішчана маёмасць на суму, большую за тысячу базавых, то да курыльшчыка будзе ўжыты артыкул Крымінальнага кодэкса. Ну і, канешне ж, давядзецца ў поўным аб'ёме кампенсаваць нанесены ўрон. Дык можа, усё ж танней пераабсталяваць пад попельніцу непатрэбную бляшанку?

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

БАРАЦЬБА ЗА «ЧЫСТЫЯ» ПРАДУКТЫ

Надзённая неабходнасць і экспартны патэнцыял

Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН аргументавана гаворыць пра неабходнасць прыняцця гэтага закона:

— Плошча зямель у свеце для вытворчасці арганічнай прадукцыі павялічылася за 10 гадоў з 30,2 млн га да 58 млн га. Аб'ём рэалізацыі арганічнай прадукцыі за гэты перыяд на сусветным рынку вырас да 89,7 млрд долараў (павялічыўся ў 2 разы). Асаблівасцю згаданага сегмента рынку з'яўляецца стабільна высокі рост (ад 10 да 20 % у год). Згодна з экспертнымі ацэнкамі, да 2020 года міжнародны абарот арганічнай прадукцыі павялічыцца да 130 млрд долараў. У сусветным маштабе вядзецца актыўная работа па распрацоўцы і ўдасканаленні нарматыўна-прававога рэгулявання арганічнай вытворчасці. З 179 краін свету, якія ажыццяўляюць гэтую вытворчасць, 87 маюць адпаведныя законы, 17 краін знаходзяцца ў працэсе распрацоўкі і прыняцця нарматыўна-прававой базы, 20 маюць стандарты, але не маюць законаў. Сярод краін СНД па арганічнай сельскай гаспадарцы прынятыя законы ва Украіне, Казахстане, Малдове, Грузіі, Таджыкістане, Арменіі... Вытворчасць арганічнай прадукцыі нарошчваецца, і яна карыстаецца вялікім попытам. Мы маем магчымасць забяспечыць сваё насельніцтва якаснай прадукцыяй і маем экспартны патэнцыял. Ужо ёсць заказы на такую прадукцыю (сёння адна толькі Расія гатовая закупіць яе на 400 млн долараў).

Ці рэальна адмовіцца ад пестыцыдаў?

У нашай краіне шырокае распаўсюджванне атрымала інтэнсіўная сельская гаспадарка (калі без павелічэння плошчаў павялічваецца прадукцыйнасць). Па вытворчасці прадуктаў харчавання на душу насельніцтва мы знаходзімся на перадавых пазіцыях. Аднак узнікае пытанне, якім чынам атрыманы такія высокія вынікі? **Прарэктар па навуковай рабоце Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, кандыдат сельскагаспадарчых навук Сяргей ТАРАСЕНКА** тлумачыць:

— Ёсць прамая залежнасць паміж ступенню хімізацыі і велічынёй атрыманага ўраджаю. Наступствы высокага ўзроўню хімізацыі — у грунтавыя паверхневыя воды трапляе ад 15 да 40 % выкарыстаных мінеральных угнаенняў. У той жа час арганічныя ўгнаенні выкарыстоўваюцца з большай карысцю для культур і з меншымі стратамі. Асноўныя мінеральныя ўгнаенні (азотныя, фосфарныя, калійныя) утрымліваюць значную колькасць соляў цяжкіх металаў. З пункту гледжання аграхіміі гэтыя солі — мікраэлементы. Гэта як у медыцыне, няма шкодных рэчываў, ёсць шкодная колькасць. Розніца паміж атрутай і лекамі толькі ў дозе. Так і тут.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Важна ведаць, што сістэмы нейтралізацыі пестыцыдаў у прыродзе не існуе. Хімічныя рэчывы (гербіцыды, інсектыцыды, фунгіцыды, стымулятары росту) трапляюць у сельскагаспадарчую прадукцыю, у глебу, у паверхневыя і грунтавыя воды. Менавіта гэта і служыць прычынай таго, што многія сёння адмаўляюцца ад іх прымянення.

Тым не менш накарміць усіх людзей арганічнай прадукцыяй — гэта ўтопія, лічыць Сяргей Тарасевіч:.

— Інтэнсіўныя тэхналогіі вырошчвання сельскагаспадарчых культур павінны развівацца. Сёння экалагізацыя сельгасвытворчасці праз зніжэнне доз сродкаў абароны раслін, адмову ад хіміі, замена іх біялагічнымі рэчывамі, выкарыстанне агратэхнічных метадаў барацьбы з пустазеллем знаходзіцца на першым месцы... Трэба імкнуцца да гэтага, але арганічнае земляробства таксама мае права на існаванне. Тым не менш пры відавочных плюсах для здароўя і экалогіі гэта вытворчасць мае недахопы. Мы праводзілі розныя даследаванні, напрыклад, падчас практыкі студэнты рукамі здымалі каларадскага жука, апрацоўвалі расліны выключна адварамі і настоямі. На жаль, індэкс урадлівасці атрымаўся нізкі.

Што датычыцца цаны, то арганічная прадукцыя каштуе на рынку даражэй, але ў яе суму ўключаны і даследаванні на ўтрыманне хімічных рэчываў. Спецыялісты нашага ўніверсітэта правялі і анкетаванне. Гатоўнасць набываць арганічную прадукцыю па цане, удвая вышэйшай за традыцыйную, выказалі 28 % рэспандэнтаў, па цане традыцыйнай — 63 %.

Справа не толькі фермераў

На думку спецыяліста, з прыняццем закона арганічнай сельгасвытворчасцю будуць займацца фермерскія гаспадаркі, гаспадары прысядзібных участкаў, але ніхто не забараняе і буйным сельскагаспадарчым прадпрыемствам займацца такой дзейнасцю. «Наш закон павінен адпавядаць прынцыпам міжнароднай арганізацыі арганічнага земляробства, тады наша прадукцыя будзе сертыфікавана і можа быць канкурэнтаздольнай. Мы павінны мець орган па сертыфікацыі і сістэму сертыфікацыі такой прадукцыі. Развіццё арганічнага земляробства грунтуецца на новых ведах і тэхналогіях, тут патрэбны і досвед, і эксперымент», — лічыць Сяргей Тарасенка.

Попыт на арганічную прадукцыю (пры пастаянным росце вытворчасці ў Еўропе толькі за 2015 год склаў больш за 28 %) стабільна перавышае прапанову. Гэта ведаюць многія, **таму спецыяліст «Цэнтра экалагічных рашэнняў» Наталля ПАРЭЧЫНА** лічыць, што рынак такой прадукцыі яшчэ не насычаны, беларусам ёсць дзе працаваць.

Першыя крокі ў нашай краіне былі зроблены яшчэ ў 90-я гады, актыўна арганічная тэма пачала развівацца ў 2009—2012 гадах: гэта былі першыя семінары, сустрэчы з практыкуючымі фермерамі, са студэнтамі, выступленне розных замежных экспертаў і практыкаў. Сёння выдаюцца і розныя публікацыі (у тым ліку ў часопісе «Родная прырода»).

Пачынаючы з 2012 года на пастаяннай аснове ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце стаў праходзіць тыдзень экалагізацыі сельскай гаспадаркі. Навучаюцца першыя намеснікі старшынь райвыканкамаў па сельскай гаспадарцы, старшыні сельсаветаў. Заняткі па арганічнай сельскай гаспадарцы праводзяць у рамках навучальных курсаў «Інавацыйнае развіццё АПК» і «Кіраванне харчовай і экалагічнай бяспекай». За гэтыя гады больш за 300 кіраўнікоў пазнаёміліся з тэмай арганічнай сельскай гаспадаркі. Да нас у краіну рэгулярна прыязджаюць замежныя эксперты, якія выступаюць як перад фермерамі, так і перад студэнтамі ўніверсітэтаў і каледжаў сельскагаспадарчых спецыяльнасцяў (Чэхія, Польшча і многія іншыя). З 2012 года праходзяць практычна штогод міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі па арганічнай сельскай гаспадарцы. Сёлета ўпершыню была канферэнцыя для маладых навукоўцаў. Колькасць удзельнікаў падобных мерапрыемстваў пастаянна расце. Гэта навукоўцы, фермеры, бізнесмены, прадстаўнікі сертыфікацыйных органаў. Праводзяцца круглыя сталы, розныя адукацыйныя візіты. Нашы спецыялісты таксама прымаюць удзел у шэрагу розных канферэнцый, як у СНД, так і ў еўрапейскіх краінах.

Арганічная вытворчасць — гэта спосаб сельскагаспадарчай вытворчасці, пры якім не выкарыстоўваюцца хімічныя прэпараты, гармоны росту, антыбіётыкі, метады геннай інжынерыі. Вынік дасягаецца за кошт правільнага выбару сорту, агратэхнічных прыёмаў, папярэджання ўзнікнення хвароб і распаўсюджвання шкоднікаў механічнымі і біялагічнымі метадамі. Практыкуюць такое гаспадаркі больш чым у 170 краінах свету.

Тэма арганічнай сельскай гаспадаркі адзначана і ў некалькіх стратэгічных дакументах: «Нацыянальны план дзеянняў па барацьбе з апустыньваннем і дэградацыяй зямель», «Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Беларусі на перыяд да 2030 года», «Нацыянальная стратэгія адаптацыі сельскай гаспадаркі да змены клімату».

— Акрамя працы з фермерамі вядзецца актыўная работа з насельніцтвам па фарміраванні пакупніцкага попыту, — адзначае Наталля Парэчына. — Калі не будзе ўнутранага попыту, цяжка будзе казаць аб развіцці арганічнай сельскай гаспадаркі ў цэлым. Таму праводзяцца фэсты, пакуль толькі для Мінска, але мы плануем пашыраць мерапрыемства на ўсе абласныя, а затым і раённыя цэнтры.

Вольга ПРАЛЮК.

КУЛЬГАЦЬ НЕ ПРЫЙДЗЕЦЦА

Калі аперацыю на каленным суставе зробяць у Гомельскай абласной бальніцы

Цяпер тут праводзяць аперацыі з дапамогай новага артраскапічнага комплексу. Відэа ў фармаце UHD 4K, магутная святлодыёдная крыніца святла і сістэма кіравання выявамі даюць магчымасці лепш разгледзець пашкоджанні костак і адразу ж іх «адрэстаўраваць». Пакуль што гэта адзіны апарат такога класа ў нашай краіне, гаворыць загадчык траўматолага-артапедычнага аддзялення Юрый КОС:

— Штогод на Гомельшчыне выконваецца каля 500 артраскапій. Пашырэнне тэхнічнага арсенала дазволіць праводзіць у два разы больш аперацый, павялічыць эфектыўнасць лячэння. Перадавыя тэхналогіі скарачаюць час аперацыі на трэць. Важна, што невялікая траўматычнасць тканак дазволіць пацыенту хутчэй вярнуцца да звычайнага жыцця.

Журналістаў у аперацыйную запрашаюць, каб яны на свае вочы пераканаліся, якім чынам 4D эфект апарата дапамагае вырашыць праблему пацыента. Антон, які пашкодзіў калена пяць месяцаў таму, тым часам сам з цікавасцю пазірае вакол і дае інтэрв'ю, знаходзячыся на аперацыйным стале. Да гэтага яму зрабілі спінальную анестэзію — ён не адчувае сваю нагу, якая ўжо падрыхтавана да ўмяшання хірургічных інструментаў.

Артраскапія — аператыўнае ўмяшанне, якое лічыцца найбольш аптымальным метадам пры механічных пашкоджаннях суставаў, артрозах, парывах звязак і некаторых запаленчых захворваннях суставаў. Штогод на Гомельшчыне выконвалася каля 500 такіх аперацый. Цяпер будзе ўдвая больш.

Антон — спартсмен. Вольная барацьба для 18-гадовага хлопца — сэнс жыцця. Ён вучыцца ў Гомельскім дзяржаўным вучылішчы алімпійскага рэзерву і будучыню звязвае толькі са спортам. Таму недарэчная бытавая траўма, якая выклікае пастаянныя болі і блакады ў каленным суставе, — сапраўдная перашкода для далейшага руху ў спорце высокіх дасягненняў. Малады чалавек спадзяецца, што новыя спартыўныя перамогі ўсё ж будуць. Між тым кансерватыўнае лячэнне, праведзенае напярэдадні, станоўчых вынікаў не прынесла. Наступны этап — аперацыя. За яе ходам спартсмен наглядае сваімі вачыма на вялізным маніторы.

Урачы робяць зусім невялікія надрэзы на калене і ўводзяць інструмент. Ён незаўважна прасоўваецца ў тканкі і, здаецца, павольна плыве ў вадкасці. Камера, а значыць, і вока хірурга бачыць павялічаную карцінку сустава знутры — выява на экране. Між тым галоўная фішка для прафесіяналаў — менавіта ў прасунутых магчымасцях гэтага комплексу. Загадчык траўматолага-артапедычнага аддзялення Гомельскай абласной клінічнай бальніцы, галоўны траўматолаг Гомельскай вобласці Юрый Кос гаворыць, што новая сістэма абсталявана магутнай святлодыёднай крыніцай святла з працяглым тэрмінам службы, плюс комплекс рабочага інструментарыя, мноства патрэбных опцый і рознага праграмнага забеспячэння:

— Усё гэта дазваляе проста падчас аперацыі ўдакладняць дыягназ — бо мы ў рэжыме анлайн бачым праблемы сустава і адразу ж карэктуем хірургічнае ўмяшанне. Гэта сапраўды новы якасны крок у параўнанні з тым абсталяваннем, на якім мы да гэтага працавалі папярэднія адзінаццаць гадоў.

Дарэчы, дыягназ, пастаўлены юнаку напярэдадні ўрачамі з дапамогай ультрагукавога даследавання і магнітна-рэзанансной тамаграфіі, — пашкоджанне меніска — не пацвярджаецца. Складаныя тэрміны, зразумелыя медыкам, для журналістаў Юрый Казіміравіч растлумачвае проста:

— Мы бачым, што храсток тут разлахмачаны. А вось і той адломак храстка, які маладому чалавеку сапраўды перашкаджаў нармальна хадзіць і тым больш змагацца з сапернікамі на дыване. Мы выдалім адарваную частку храстка, якая блакіруе калена. Затым пашкоджаную частку «адшліфуем». Гэта значыць, правядзём хондрапластыку. Фактычна абсталяванне дазваляе нам падчас аперацыі ўдакладняць дыягназ і прыняць адзінае правільнае рашэнне.

На экране адарваны кавалачак храстковай тканкі выглядае як белы каменьчык. Насамрэч на тонкім інструменце хірурга — ледзь заўважны, у некалькі міліметраў абломачак. Менавіта ён і быў той прычынай, чаму нага ў Антона страчвала часам нармальныя функцыі. Пятнаццаць хвілін — і калегі Юрыя Коса пачынаюць зашываць дзве маленькія дзірачкі на калене хворага.

Сярод пацыентаў галоўным чынам мужчыны ад 18 да 40 гадоў. Урачы кажуць, што новае абсталяванне дазволіць праводзіць удвая больш аператыўных умяшанняў. Да таго ж павялічыцца эфектыўнасць лячэння і значна скароціцца час правядзення аперацыі. Дарэчы, на артраскапічны комплекс было выдаткавана каля $240 тысяч са сродкаў абласнога бюджэту.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ СП «ВЕСТАВТО» ОАО

Наименование объекта		Начальная цена продажи, руб. без НДС	Размер задатка, руб.
ЛОТ № 1. Капитальное строение (инв. №100/С-10202) – гостиница, пл. 8117,3 кв. м, расположенное на земельном участке пл. 1,1818 га с кадастровым номером 1401000000010002563 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Коммерческая, 19		**1 946 880,00**	**24 336,00**
Организатор торгов	РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал		
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов		
Условия оплаты	Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи		
Условия продажи	Без условий		
Номер р/с для перечисления задатка	BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, г. Брест, ул. Мицкевича,10 УНП 201028245		

Аукцион состоится 27 марта 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10 – 325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Перечень документов для участия в аукционных торгах и иную информацию можно узнать по телефонам: (0162) 20-92-13; 21-88-81

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 26 марта 2018 г. до 17.00

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Трест Белтрансстрой», г. Минск, ул. Советская, 8

Предмет аукциона

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Лот № 1				
Механический склад цемента	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	45,2 кв. м	100/С-47322	г. Брест, ул. Карасева, д. 100
Здание компрессорной станции	Здание специализированное иного назначения	62,4 кв. м	100/С-47332	
Начальная цена Лота № 1 с НДС		**11 692,56 бел. руб.**		
Лот № 2				
Растворный узел	Здание специализированное иного назначения	498,7 кв. м	100/С-47330	г. Брест, ул. Карасева, д. 100
Начальная цена Лота № 2 с НДС		**23 261,52 бел. руб.**		
Лот № 3				
Административное помещение	Административное помещение	59,9 кв. м	350/D-315996	г. Гомель, ул. Д. Бедного, 7-6
Начальная цена Лота № 3 с НДС		**51 294,00 бел. руб.**		
Лот № 4				
Административное помещение	Административное помещение	65,8 кв. м	350/D-315997	г. Гомель, ул. Д. Бедного, 7-7
Начальная цена Лота № 4 с НДС		**29 293,20 бел. руб.**		

Сведения о земельном участке: Лоты № 1, № 2 расположены на земельном участке пл. 0,8420 га, предоставленным продавцу на праве постоянного пользования. Целевое назначение: обслуживание производственной базы. Продавец, в зависимости от количества реализованных лотов, в установленном законодательством порядке после проведения аукциона обращается за осуществлением регистрационных действий в отношении земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона. По лотам № 3, № 4 покупателю будут определены доли в праве на земельный участок пл. 0,4061 га, предоставленного для эксплуатации и обслуживания общежития, физкультурно-оздоровительного комплекса СМП № 716, административного помещения

Срок подписания договора купли-продажи: по лотам № 1, № 2 после выделения самостоятельного земельного участка для обслуживания реализованного лота (лотов) (либо определения доли в праве), между продавцом и покупателем в течение 10 (десяти) рабочих дней после получения продавцом свидетельства о государственной регистрации прав на земельный участок, должен быть заключен договор купли-продажи. По лотам № 3, № 4 договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.02.2018 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**26.03.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Советская, 8 ОАО «Трест Белтрансстрой»**
Дата и время окончания приема документов	**23.03.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42; auction@cpo.by; www.cpo.by**

Гайненский сельский исполнительный комитет просит опубликовать следующее объявление: «Гайненский сельский исполнительный комитет проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов»

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка	Наличие инженерных сетей	Начальная цена бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)	Расходы по изготовлению документации
1	д. Беланы, ул. Березовая, уч. № 1. Кадастровый номер 623280800801000043	0,1451	Подъездные пути удовлетворительные	6000,00	1200,00	1463,99
2	д. Родевичи, ул. Школьная, У-14В. Кадастровый номер 623280810601000075	0,2018	Подъездные пути удовлетворительные	3200,00	640,00	1538,46

Аукцион проводится 14.04.2018 г. в 10.00 по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, 2, Логойского района, Минской области, здание Гайненкого сельского исполнительного комитета. Документы принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, до 11 апреля 2018 года (последний день подачи документов 10.04.2018 г. до 17.00) по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, 2, Логойского района, Минской области.

Задаток перечисляется на р/с № BY60AKBB36006190211080000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, г. Минск, код 795, ОКПО 04431493,УНН 600537220, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести оплату земельного участка и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Контактные телефоны: 801774-56436, 56498

Сообщение о созыве очередного собрания акционеров ОАО «Проминвест»
30 марта 2018 года в 16.00 состоится собрание акционеров ОАО «Проминвест» по адресу: г. Минск, Логойский тракт, 31, магазин «Хозтовары-Мебель»

Повестка дня

1. Об итогах деятельности общества за 2017 г. Утверждение годового баланса.
2. О выплате дивидендов за 2017 год и распределение прибыли.
3. Избрание выборных органов.

Начало регистрации в 15.30.

УНП 100646457

■ Рэзананс

«Прачытаў беларускую кнігу сам — парай іншаму»

Ёсць такое свята — Міжнародны дзень роднай мовы. Святкуецца ён 21 лютага і, як правіла, заўсёды нечым здзіўляе. Сёлета, у прыватнасці, парадавала тое, што навіны на тэлеканалах Беларусі гучалі па-беларуску.

Аднак назаўтра, як і варта было чакаць, свята скончылася, і ўсё вярнулася на ранейшы рускамоўны лад. А значыць, праўду пісала «Звязда» (28.02): дня роднай мовы мала. Нам патрэбен, як мінімум, год... Бо гэта пра нас японскі славіст Курода пісаў: «Не разумею я гэтай ціхай і загадкавай краіны, жыхары якой пагарджаюць (грэбуюць) сваёй мовай». Яе, беларускую, і сапраўды амаль не пачуеш па тэлебачанні і радыё, у дзяржаўных установах, у крамах, на вуліцах. А будзе ж яшчэ горш (калі нічога не зменіцца), бо ў школах урокі беларускай мовы толькі раз на тыдзень. Што на іх можна вывучыць, засвоіць, зразумець?

Між тым успомнім жыццёвую аксіёму: мы — грамадзяне Беларусі, беларуская мова — першая дзяржаўная. Значыць, трэба, каб яна гучала ў нашай краіне, каб жыла і развівалася, каб у яе была будучыня...

Відавочная ісціна: засваенню роднай мовы паспрыяла б чытанне беларускіх кніг, беларускамоўных перыядычных выданняў. Любому (асабліва сельскаму) бібліятэкару душа баліць, калі вёска па-руску чытае Васіля Быкава альбо Івана Шамякіна.

Але ж шчырыя прыхільнікі беларускай літаратуры ў раёне таксама ёсць. У Пагосцкай бібліятэцы сярод такіх урач-стаматолаг Галіна Апалінараўна Дылейка, у Лешніцкай — пенсіянерка Таццяна Тарасаўна Маразенка, у аграгарадку Багушэвічы — рабочы сельскага Савета Васіль Віктаравіч Макарэвіч (яго гадавы рэкорд — 35 твораў беларускай літаратуры — ад класікаў да сучаснікаў). Жыхарка аграгарадка Уша, былая руплівіца мясцовага калгаса Валянціна Аляксандраўна Кандранцова лічыць, што добрая кніга заслугоўвае, каб да яе звярталіся не раз. Сярод яе любімых творцаў Васіль Быкаў, Міхась Лынькоў, Сяргей Грахоўскі, Уладзімір Ліпскі... У выніку на «рахунку» Валянціны Аляксандраўны 25 прачытаных альбо перачытаных беларускіх кніг.

Шкада, што такіх вось чытачоў няма сярод вясковых настаўнікаў, моладзі і падлеткаў. А таму ці трэба здзіўляцца, што элементарныя пытанні пра беларускую кнігу здольныя многіх загнаць у так званы ступар. Папрасіце мінакоў на вуліцы ці студэнтаў назваць, напрыклад, пяць твораў Быкава ці пяць сучасных беларускіх пісьменнікаў. Што пачуеце?

На першае з пытанняў адказы, магчыма, будуць, а вось на другое...

Ды і ці трэба таму здзіўляцца, калі нават супрацоўнікі нашага тэлебачання не ведаюць, дзе ў беларускіх словах правільна ставіць націск, не могуць назваць імя і сапраўды вядомага пісьменніка. Да беларускай літаратуры як нечага другаснага (ці другараднага?) ставяцца нават прадстаўнікі інтэлігенцыі... У Расіі кажуць, што чалавека, які не ведае на памяць хоць бы восем радкоў Лермантава, нельга лічыць культурным. А як у нас — наконт васьмі радкоў Багдановіча ці Купалы? Баюся, што прачытаюць іх вельмі нямногія, нават з тых, хто мае вышэйшую адукацыю і, як ні сумна прызнацца, усё тую ж прафесію настаўніка. Сярод іх і сёння ёсць, на жаль, педагогі, якія не чытаюць нічога, апроч так званай грыфаванай літаратуры. Але ж грыф Міністэрства адукацыі неабходны для падручнікаў, якіх мала для таго, каб выкладаць, напрыклад, гісторыю...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Бібліятэкары ўсё часцей з нейкай сарамлівасцю прызнаюцца, што да іх, каб пацікавіцца кніжнымі навінкамі, не зазіраюць нават настаўнікі-філолагі. Дык ці можна папракаць падлеткаў, што яны не любяць чытаць? Ну сапраўды, што з сучасных беларускіх твораў можа параіць настаўнік, які ніколі не гартаў часопісы «Полымя» ці «Маладосць»?

...Бібліятэка, як ніякі іншы грамадскі інстытут адчувае моц рэальнага ўздзеяння кнігі на чалавека. Для таго каб да яе — у тым ліку беларускай — прыцягнуць увагу наведвальнікаў, у нас прайшоў месячнік «Прыгарніся да роднага слова». Кожны чацвер месяца пазіцыянаваўся як беларускамоўны дзень і дзень паглыбленай прапаганды твораў беларускіх аўтараў. Штодзённа ў вясковых бібліятэках праводзіліся акцыі «Кожнаму чытачу — беларускую кнігу». Практыкаваліся агляды-сюрпрызы «Кніга — падарунак прыхільніку роднай мовы», «Твае першыя кніжкі — па-беларуску», «Беларуская літаратура: нам ёсць чым здзівіць чытача».

Бібліятэкары звярталі асаблівую ўвагу наведвальнікаў на лепшыя мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў — юбіляраў месяца (года) Святланы Алексіевіч, Валерыя Гапеева, Максіма Гарэцкага, Янкі Маўра, Анатоля Бутэвіча, Уладзіміра Арлова, Вячаслава Адамчыка, Адама Міцкевіча... У ходзе рэкламных акцый месяца — «Знакавыя кнігі», «Кніга — фаварыт», «Кнігі жадаюць пазнаёміцца», «Эліт-кнігі юбіляра», «Незаслужана забытыя». Прайшлі сустрэчы-бенефісы з аматарамі чытання беларускіх твораў на роднай мове, працаваў лозунг «Прачытаў беларускую кнігу сам — парай іншаму».

Па выніках месячніка Пагосцкая сельская інтэграваная бібліятэка стала найлепшым папулярызатарам беларускай мовы і літаратуры. Добрыя паказчыкі ў лютым па Ушанскай, Любушанскай, Багушэвіцкай бібліятэках.

Запатрабаванасць беларускай кнігі ў бібліятэцы — паказчык таго, як яна падаецца чытачам, як бібліятэкар сам ставіцца да роднага слова.

Тамара КРУТАЛЕВІЧ,
загадчыца аддзела маркетынгу Бярэзінскай Цэнтральнай раённай бібліятэкі

■ Так ці не? Практыкум

НЕ БЛЫТАЦЬ ПАГОДУ З НАДВОР'ЕМ

«У нашай мове ёсць словы «цана» і «кошт». Дапамажыце разабрацца ў розніцы паміж іх значэннямі», — просіць спадар Санько з Брэста. Ад яго ж пытанні, ці можна ўжываць слова «гатоўка» і як будзе правільна — «мы жывём» ці «мы жывем?»

Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь Саламевіч і Леў Глушыцкі.

1. Цана і кошт — словы блізказначныя. У розных сферах **кошт** мае некалькі азначэнняў. У агульнамоўных слоўніках кошт ёсць вартасць чагосьці, выражаная ў грашах. Яна складаецца з такіх паказчыкаў, як затраты на сродкі вытворчасці тавару, яго транспартаванне і заработную плату. Але і **цана** — гэта грашовае выражэнне вартасці тавару. Таму адрозненні паміж словамі *цана* і *кошт* (калі мы гаворым не пра строгую тэрміналогію) у большасці выпадкаў маюць не сэнсавы, а стылістычны характар. Напрыклад, *«І які кошт гэтага прадукту?»* — пытанне, якое мог бы задаць адзін калега-бізнесмен другому, просты ж пакупнік у краме спытае: *«Колькі гэта каштуе?»*, *«Па якой цане гэта малако?»* ці *«Пачым у вас смятана?»*. Ён жа заўважыць, што цэны (а не кошты!) зноў павысіліся...

2. Слова **гатоўка** ў нашай мове безумоўна ёсць. Паходзіць яно ад старабеларускай назвы *готовые гроши (пенези)*, што і якраз абазначала **наяўныя грошы**. Сёння назоўнік *гатоўка* мае адценне гутарковасці. Але тым не менш у размовах, у мастацкіх творах, а часам і ў публіцыстычных тэкстах гэтае слова можа і павінна ўжывацца.

3. У тых выпадках, калі мы проста адказваем на пытанне пра жыццё-быццё, правільна будзе сказаць менавіта **жывём** (або ідзём, бяром, спадзяёмся...). У Якуба Коласа ў «Новай зямлі» чытаем, напрыклад: *Жывём, клапоцімся, і дбаем, // І ўсе нарэшце паўміраем...*

Аднак ёсць выпадкі, калі ў такіх словах трэба пісаць -ем (-эм). Гэта сітуацыя, калі мы не расказваем, а заклікаем да чагосьці — ужываем дзеяслоў у загадным ладзе. Напрыклад, адна з рубрык «Звязды» называецца «Усміхнемся!» Калі сфармуляваць па-іншаму, то гэта значыць не «мы (калі-небудзь) усміхнёмся», а «давайце ўсміхнемся!»

У АБАРОНУ СЛОЎ

Гэтым разам мы вырашылі «абараняць» не слова, а цэлы фразеалагізм **весці рэй**.

Сёння можна пачуць, што гэты выраз незразумелы, неўжывальны, і... паспрачацца, бо яго права на існаванне можна пацвердзіць прыкладам з творчасці класіка нашай літаратуры Янкі Купалы (зусім нядаўна, дарэчы, выйшаў першы том яго персанальнай энцыклапедыі). У «Бандароўне» пясняр піша: *У гульні сама рэй водзіць, // Весела міргае, // Задзіўляе ўсіх чыста, // Як зара якая.*

Ужывалі гэты фразеалагізм і Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Кандрат Крапіва, іншыя пісьменнікі з выдатным стылем і пачуццём мовы.

Што да сучаснай літаратурнай, то гэты выраз мае значэнне 'быць завадатарам, верхаводзіць, аказваць уплыў на ход чагонебудзь'. Сярод сінонімаў — *даваць (задаваць) тон, іграць першую скрыпку, камандаваць парадам, правіць баль, рабіць пагоду*. Яна, паводле слоўнікаў, па-першае, стан атмасферы ў дадзенай мясцовасці, а па-другое — добрае надвор'е. А яно бывае толькі на дварэ: сцвярджаць, што «важней за ўсё надвор'е... у доме», мякка кажучы, нелагічна

■ Чалавек — чалавеку

ЦІКАВЫ БЫЎ КОРАНЬ

...Хто пра што, а я пра сваю любімую школу, пра дзяцей.

Такім чынам — урок беларускай мовы. Тэма яго — корань слова. Перш-наперш тлумачу матэрыял, дзеці запісваюць прыклады, потым самастойна, як і патрабуе тэма ўрока, вызначаюць карані...

Некалькі слоў я загадзя напісала на дошцы. Адкрываю іх, кажу:

— Карані знойдзе... Андрэй. Калі ласка!

Хлопчык устае з месца, але кіруе чамусьці не да дошкі, а да дзвярэй:

— Я мігам, — кажа, — бабе Валі дровы прывезлі.

«Пры чым тут, думаю, баба?.. Пры чым тут дровы?»

— Вярніся, — прашу хлопчыка, але тога і след прастыў.

Мы працягваем урок — шукаем карані слоў, як раптам дзверы адчыняюцца і ў іх з'яўляецца... Спачатку — корч — ладны, сапраўдны... А следам за ім — Андрэй.

— Во, — кажа, — корань. Я сам знайшоў!

...І, між іншым, досыць цікавы! Потым мы скарысталі яго для розных дробных вырабаў.

А вось «корань слова» давялося шукаць з Андрэем пасля ўрокаў.

Сафія АТРОХАВА, *в. Селішча, Слуцкі раён*

■ Спявай, душа!

«У ДАМАВІНУ БЕЗ ПАРЫ МЯНЕ КЛАЛІ ДАКТАРЫ...»

Некалі «Звязда» збірала прыпеўкі...
І збірае зараз. А таму — пішыце! І, калі ласка, спявайце!

Малады ў нас аграном,
Мае новенькі дыплом.
Ды гадае трэці дзень,
Жыта ў полі ці ячмень?

Самагонку баба гнала,
Каб хутчэй разжыцца.
Ды такой нервовай стала,
Што ката баіцца.

Закачала сілікон
Дзеўка сабе ў грудзі.
У кватэру праз балкон
Зараз лазіць будзе.

Намалюю я тату́
Яркую, багатую
На пупок і на пяту
І на «кропку» пятую.

Па ваду хадзілі цёткі,
Разам з ёй — насілі плёткі.
А цяпер праз інтэрнэт
Тое робіць увесь свет!

Ой, Малахаў, будзь ласкавы,
Разбярыся ў маіх справах:
Запісаць малому ў таты
Віцьку, Міцьку ці Ігната?

Паўтара рубля з зарплаты
Заплаціў у загсе муж.
Я ўсю жытку вінавата
І ніяк не разлічусь!

На прыём пайшла па блату
Аддала ўсю зарплату.
Зараз — зубы на паліцу...
Буду голадам лячыцца.

Ў дамавіну без пары
Мяне клалі дактары.
А знайшла талковую
І жыву вясёлаю.

Любоў ЧЫГРЫНАВА,
г. Мінск.

ВОСЬ ЖА ЯЗВА!

Чаму нельга запускаць гастрыт і як лячыць каварную Хелікабактэр

Чым небяспечнае такое захворванне як хранічны гастрыт, пры якіх умовах яно ператвараецца ў язвавую хваробу, навошта і як выяўляць бактэрыі Хелікабактэр пілары і ці заўсёды іх наяўнасць вядзе да раку страўніка, расказала загадчык аддзялення прафілактыкі 31-й гарадской паліклінікі Мінска Таццяна ПЛІСЮК.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Таццяна Аркадзеўна, як узнікае гастрыт?

— Гастрыт — гэта запаленне слізістай абалонкі страўніка. Ён узнікае па некалькіх прычынах. Асноўная крыніца вострага гастрыту — харчовая таксікаінфекцыя, або папросту атручванне няякаснай ежай. Праз дзве-тры гадзіны ўзнікае вострае запаленне слізістай страўніка, якое суправаджаецца высокай тэмпературай і рвотай. Таксама могуць далучацца млоснасць, галавакружэнне, панос.

— Чым атручванне адрозніваецца ад ротавіруса?

— Ротавірусная інфекцыя трапляе ў арганізм праз верхнія дыхальныя шляхі. Ёсць невялікі, да трох дзён, інкубацыйны перыяд. І тут, як правіла, хварэе не хтосьці адзін у сям'і, а ўсе. Калі ў дзіцячым садку, то большасць групы. Сімптомы падобныя да атручвання — ірвота, тэмпература, панос. А вось атручванне заўсёды можна звязаць менавіта з няякаснай ежай. Часта падлеткі прыходзяць з Макдональдса — фаст-фуд, бульба фры, перасмажаная ў алеі, які некалькі разоў выкарыстоўваецца, — і праз пару гадзін пачынаецца рвота, паднімаецца тэмпература. Такая нездаровая ежа выклікае прыступ гастрыту. Ротавірусная інфекцыя лечыцца супрацьвіруснымі прэпаратамі, а харчовая таксікаінфекцыя патрабуе антыбіётыкаў.

— Ці ёсць прадукты, якімі мы знішчаем страўнік?

— Тут гаворку трэба весці хутчэй не аб прадуктах, а аб няправільным харчаванні ў цэлым. У нас, на жаль, многія, у тым ліку дзеці і падлеткі, часта не паспяваюць паесці, харчуюцца няправільна. Прымаць ежу трэба сама меней шэсць разоў на дзень, але невялікімі порцыямі. Па-першае, гэта дапамагае не набіраць лішнюю вагу. Па-другое, калі мы харчуемся кожныя 3-4 гадзіны, паляпшаецца работа страўнікава-кішачнага тракта. Ежа — найлепшы жаўцягонны сродак. Пасля яе прыёму выпрацоўваецца жоўць, яна дапамагае ў ператраўліванні страў. Калі пасля сняданку мы цэлы дзень не маем магчымасці харчавацца правільна, абмяжоўваемся перакусамі, а падчас вячэры аб'ядаемся, адбываецца расцяжэнне слізістай страўніка і магутны выкід ферментаў: жоўцевых, падстраўнікавых, у вялікай колькасці выпрацоўваецца страўнікавы сок, жоўць. Гэта вельмі высокая нагрузка на стрававальную сістэму і ўвесь арганізм. Некаторыя адразу пасля багатай вячэры кладуцца спаць, што таксама няправільна. Калі па такім прынцыпе харчавацца доўгі час, узнікнуць гастрыт, язва і атлусценне.

Калі казаць пра рацыён, то ежа павінна быць пераважна вараная, абавязкова патрэбныя кашы, малочныя прадукты, супы, мяса, рыба, садавіна і гародніна. Фаст-фуд, бульба фры ў рэстаранах хуткага харчавання — ежа на крайні выпадак. Перакусваць гэтым кожны дзень нельга.

— Як пазбегнуць хранічнага гастрыту?

— Востры гастрыт, які ўзнікае калі мы нечым атруціліся, вылечваецца. І калі вы ведзяце здаровы лад жыцця і правільна харчуецеся, ён не ператвараецца ў хранічны. Калі ж вы пастаянна парушаеце прынцыпы здаровага харчавання (недаядаеце, а пасля пераядаеце, маеце шкодныя звычкі, у прыватнасці, прымаеце алкаголь і курыце, асабліва на галодны страўнік), унутраны слой эпідэрмісу пашкоджваецца. Калі слізістую не лячыць, захворванне пераходзіць у хранічную форму. Спачатку запаляецца ўнутраная абалонка страўніка. Калі працэс ідзе далей, паглыбляецца пад слізістую — утвараюцца язвы. Калі язвавую хваробу не лячыць, гэта можа прывесці да раку страўніка.

— Бактэрыя Хелікабактэр пілары таксама выклікае гастрыт?

— Так, і гастрыт, і язвавую хваробу. Адзін з характэрных сімптомаў пры гэтых захворваннях — галодныя болі. Здаецца, калі нешта з'есці, баліць менш. На самай справе, гэта падманлівае адчуванне. Ад ежы страўнік раздуваецца, павялічваецца колькасць салянай кіслаты. З-за гэтага з'яўляецца пякотка, адрыжка кіслым, метэарызм, запоры. Такія сімптомы характэрныя, калі кіслотнасць страўніка павышаная. З паніжанай кіслотнасцю скаргі ў пацыентаў крыху іншыя, але большасць хворых адчуваюць менавіта пералічаныя дыспепсічныя сімптомы.

— Галодны страўнік не павінен балець?

— Звычайна мы адчуваем голад, болі ў норме быць не павінна. Многае яшчэ залежыць ад болевага парогу. Некаторыя хворыя адчуваюць толькі слабасць. Пасля прыёму ежы ў норме вы таксама не павінны нічога адчуваць. З язвавай хваробай пасля прыёму ежы становіцца лягчэй, але хутка боль зноў вяртаецца. Яе зноў імкнуцца заядаць, пацыенты з язвамі і гастрытамі часам нават набіраюць вагу, але пакутуюць ад ацёчнасці.

— Гэта значыць, хвароба не працякае схавана...

— Так. Але ўсё роўна не ўсе пацыенты звяртаюцца да ўрача. Прымаюць сімптаматычныя прэпараты, соду — ім становіцца крышачку лягчэй. У каго невысокі болевы парог, жывуць з болямі. І гэта вядзе да сумных вынікаў. Так узнікаюць запушчаныя формы раку страўніка. Таму калі перыядычна ўзнікаюць болі ў страўніку, запоры і панос, трэба абследавацца.

— Якім чынам гэта робіцца?

— Выконваецца гастрафібраскапія — агляд слізістай страўніка з дапамогай гастраскопа, больш вядомага як зонд. Гэта дзве не самыя прыемныя хвіліны, але працэдура вельмі неабходная. Цяпер абавязкова выконваецца біяпсія, каб не прапусціць анкалагічныя захворванні. І правяраюць на наяўнасць Хелікабактэр. Калі іх выяўляюць, прызначаецца эрадыкацыйная схема, скіраваная на іх знішчэнне.

— Якімі яшчэ метадамі можна выявіць Хелікабактэр?

— Па аналізе крыві, а таксама выконваецца дыхальны тэст. Калі ўпершыню выяўляецца язвавая хвароба, пацыенту прызначаецца лячэнне, і пасля, калі не хочацца зноў глытаць зонд, ёсць такая альтэрнатыва. Аналіз крыві на Хелікабактэр робіцца пакуль толькі на платнай аснове, а ў паліклініках, як правіла, прапануюць бясплатны дыхальны тэст.

— Хранічныя гастрыты — гэта хвароба якога ўзросту?

— Такі дыягназ ставіцца нават дзецям школьнага ўзросту. У многім тут сваю ролю адыгрывае спадчынны фактар: калі ў бацькоў ёсць Хелікабактэр, а харчуюцца ў сям'і, вядома, з агульнага посуду, то вялікая верагоднасць, што гэта бактэрыя будзе і ў дзяцей. Хелікабактэр гіне толькі пры тэмпературы 60 градусаў, яна добра знішчаецца ў пасудамыечных машынах, але зразумела, што ў хатніх умовах посуд у такой гарачай вадзе ніхто не мые. Таму, калі ў некага выяўляюцца гэтыя бактэрыі, рэкамендуецца лячэнне ўсёй сям'і.

Як вядома, не ўсе дзеці харчуюцца правільна. Іх здароўе залежыць ад таго, як іх кормяць бацькі. Важна не ігнараваць харчаванне ў школе, каб не было вялікага перапынку ў прыёмах ежы. Спачатку ў дзяцей развіваецца гастрыт, і яны прэтэндэнты на язву, асабліва язву дванаццаціперснай кішкі. Гэта стрэсавая язва. Падлеткі асабліва да яе схільныя з-за сваёй нявстойлівай псіхікі. І калі язва страўніка больш сустракаецца ў дарослага насельніцтва, то язва дванаццаціперснай кішкі — гэта пераважна хвароба падлеткаў.

— Хелікабактэр ва ўсіх выклікае язву?

— Ёсць людзі, якія жывуць з гэтай бактэрыяй усё жыццё, і яна не выклікае язвавую хваробу. Таму падхапіць яе можна дзе заўгодна: у сталоўцы, кафэ, у гасцях, калі няякасна апрацаваны посуд. Але лячыць яе важна, бо гэта прафілактыка раку, так мы не дапускаем утварэння лімфомы страўніка. Іншая справа, што не ва ўсіх Хелікабактэр можна знішчыць, лячэнне дае вынік прыкладна ў 90 % выпадкаў. Таму лепш не дапускаць запалення слізістай і прытрымлівацца прынцыпаў правільнага харчавання.

САЛЯВАЯ ПЯСОЧНІЦА

Некалькі гадоў таму ў 4-й сталічнай дзіцячай клінічнай паліклініцы з'явіўся саляны пакой. Гэты метад лячэння лекары прызначаюць хворым з бранхіяльнай астмай і іншымі захворваннямі органаў дыхання, гіпертанічнай хваробай.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У пакоі створаны асаблівы мікраклімат, і дзеткі на працягу пэўнага часу там проста знаходзяцца і дыхаюць распыленымі ў паветры драбнюткімі часцінкамі солі. Хлопчыкі і дзяўчынкі з задавальненнем гуляюць тут, як у пясочніцы. За дзень пакой могуць наведаць да сямідзесяці чалавек.

Як пазбавіцца ад непрыемнага паху з рота

Ад непрыемнага паху з рота ў той ці іншай ступені пакутуюць 70 % людзей на планеце. Для гэтай з'явы нават прыдумалі спецыяльную назву — галітоз. Як адшукаць і ліквідаваць прычыну агіднага паху і стаць уладальнікам прыемнага свежага дыхання?

Жывуць з гэтай праблемай восем з дзесяці чалавек. І амаль усе яны непрыемнага паху не адчуваюць. Але ёсць спосаб праверыць, ці прысутнічае ў вас непрыемны пах з рота. Калі правесці па тыльным баку далоні языком, пачакаць 10 секунд, а потым прыкласці руку да носа, можна адчуць непрыемны пах ці яго адсутнасць.

Раніцай пах з рота моцны амаль ва ўсіх людзей, і гэта нармальна. Ноччу ў роце менш сліны, а менавіта яна знішчае большую частку мікробаў. І да раніцы мікробы кішаць і на зубах, і на шчоках, і на языку. Але калі пасля чысткі зубоў і ежы непрыемны пах застаўся, гэта можа сігналізаваць пра карыес, парадантыт ці стаматыт. Можа папярэджваць пра бранхіт ці запаленне лёгкіх, захворванне нырак, печані ці цукровы дыябет. І нават аб анкалогіі страўнікава-кішачнага тракта.

Але ўсё ж такі ў 90 % выпадкаў праблема хаваецца ў іншым. Справа ў тым, што водар тухлых яек ці сапсаванага мяса ёсць у страўніку амаль заўсёды і амаль ва ўсіх. Але з нармальным харчаваннем у здаровага чалавека страўнік ад стрававода аддзяляецца спецыяльнымі дзверцамі — сфінктарам. А ён не ва ўсіх працуе правільна і прымыкае шчыльна — такія людзі звычайна адчуваюць пякотку.

Як жа змагацца з непрыемным пахам? У першую чаргу неабходна правільна чысціць зубы і карыстацца зубной ніткай. Ва ўсім свеце гэта ўжо даўно адзін з галоўных сродкаў гігіены рота, і чысціць трэба не толькі зубы, але і язык. Але самы просты сродак барацьбы з галітозам цалкам бясплатны — як мага часцей паласкаць рот чыстай вадой і не забываць выпіваць некалькі шклянак яе ў дзень.

Таксама нельга галадаць. Калі страўнік вельмі доўга пусты, то пры ўсім здароўі сістэмы можа ўзнікнуць часовы галітоз.

Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

■ Сацыяльны ракурс

ЗАРОБКІ ПЕДАГОГАЎ, ЭКСПЕРЫМЕНТ У ГАЛІНЕ І ПРЭСТЫЖ ПРАФЕСІІ

Як партнёры шукаюць адказы на няпростыя пытанні?

«Павышэнне прэстыжу прафесіі педагога заўсёды заставалася прыярытэтным напрамкам у дзейнасці галіновага прафсаюза», — падкрэсліў на сумеснай з Міністэрствам адукацыі калегіі старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА. — Мы імкнёмся да таго, каб кожны разумеў: яго праца і прафесіяналізм будуць годна ацэненыя. На рэалізацыю гэтай задачы накіравана і пагадненне паміж Міністэрствам адукацыі і Беларускім прафесійным саюзам работнікаў адукацыі і навукі. Мы ўдзячныя нашаму сацыяльнаму партнёру за канструктыўны падыход і разумеем, што магчымасці галіны — не бязмежныя, таму шэраг праблемных пытанняў яшчэ чакае свайго вырашэння. Менавіта на іх і будуць сканцэнтраваныя нашы намаганні».

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

БОЛЕВЫЯ КРОПКІ

«Жорсткая партнёрская работа», — менавіта так ахарактарызаваў дзелавыя стасункі з галіновым прафсаюзам **намеснік міністра адукацыі Сяргей РУДЫ.** «Наша сумесная праца складная і адказная. Тым больш што мы пастаянна маем цэлы набор прапаноў ад нашага прафсаюза», — адзначыў ён.

Летась у цэнтры агульнай увагі знаходзіліся пытанні, якія датычацца арганізацыі і нармавання працы педагагічных работнікаў; аплаты працы асобных катэгорый работнікаў, у тым ліку тых, што задзейнічаны ў арганізацыі падвозу навучэнцаў; работнікаў, што накіроўваюцца на работу ў аздараўленчыя арганізацыі. На парадку дня былі пытанні прафесійнага пенсійнага страхавання педагагічных работнікаў, унясення змяненняў у кваліфікацыйныя характарыстыкі асобных пасад работнікаў адукацыі, распрацоўкі механізма накіравання вызваленых у выніку аптымізацыі фінансавых сродкаў на патрэбы галіны.

Але спачатку некалькі лічбаў. **Сярэднямесячная заработная плата ў адукацыі за студзень — снежань 2017 года склала 557,7 рубля,** у тым ліку ў педагагічных работнікаў 632,4 рубля, у настаўнікаў 673,5 рубля, прафесарска-выкладчыцкага складу 987,6 рубля. Памеры вучэбных стыпендый вагаліся ад 51,85 рубля (мінімальная) да 99,33 рубля (максімальная). У адносінах да бюджэту пражыткавага мінімуму мінімальная стыпендыя склала толькі 27 %, максімальная — 51,6 %. Для параўнання: у 2013 годзе гэтыя суадносіны складалі адпаведна 40 % і 76 %. Таксама працягваецца тэндэнцыя зніжэння тэмпаў росту памеру тарыфнай стаўкі першага разраду ў адносінах да бюджэту пражыткавага мінімуму.

— Перагляд тарыфнай стаўкі першага разраду з улікам змянення памеру мінімальнай заработнай платы застаецца надзвычай актуальным. ЦК прафсаюза неаднаразова накіроўваў прапановы ў Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі па пытаннях ажыццяўлення даплат да ўзроўню мінімальнай заработнай платы работнікам галіны, у якіх налічаная заработная плата ніжэйшая за памер мінімальнай заработнай платы. Гэта датычыцца як прадстаўнікоў рабочых прафесій, так і кваліфікаваных спецыялістаў, — паведаміў Аляксандр Бойка. — Работнікі, якія тарыфікуюцца па адным і тым жа разрадзе, маюць аднолькавы працоўны стаж, але розныя памеры прэміі ў адпаведнасці з іх асабістым укладам у вынікі працы, атрымліваюць па факце з улікам даплат аднолькавы заробак у памеры мінімальнай заработнай платы. **Нізкі ўзровень заработнай платы работнікаў галіны з'яўляецца асноўнай праблемай, якая пастаянна ўзнімаецца на сумесных пасяджэннях прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі і Міністэрства адукацыі.**

ХТО НАСТУПНЫ?

Летась міністэрствам і прафсаюзам сумесна прапрацоўвалася магчымасць удасканалення сістэмы аплаты працы прафесарска-выкладчыцкага складу. «Апошняе павышэнне заробкаў у вышэйшай школе праводзілася ў студзені 2012 года і закранала яно выкладчыкаў ВНУ, якія не маюць вучоных ступеняў і званняў. Таму важным дасягненнем з'яўляецца павышэнне з 1 снежня 2017 года тарыфных ставак прафесарска-выкладчыцкаму складу на 30 %», — падкрэсліў Аляксандр Бойка.

— У 2018 годзе ў мэтах выканання даручэнняў Прэзідэнта, дадзеных ім на Рэспубліканскім педагагічным савеце, міністэрства працягне работу над пытаннем павышэння заработнай платы педработнікам устаноў адукацыі ўсіх узроўняў, — запэўніў Сяргей Руды. — Саветам Міністраў даручана распрацаваць і ўнесці адпаведныя прапановы па дашкольнай адукацыі. Акрамя таго, па даручэнні Прэзідэнта створана рабочая група пад кіраўніцтвам рэктара БДЭУ Уладзіміра Шымава, якая павінна распрацаваць і ўнесці на разгляд кіраўніка дзяржавы свае прапановы па ўдасканаленні аплаты працы прафесарска-выкладчыцкага складу, павышэнні зацікаўленасці ў выніках педагагічнай і навуковай дзейнасці.

Сяргей Руды і Аляксандр Бойка паведамілі, што зараз **ідзе работа над праектам Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб удасканаленні аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый» і пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб аплаце працы работнікаў бюджэтных арганізацый».**

— Прадстаўленыя праекты спрашчаюць механізм разліку заработнай платы работнікаў бюджэтнай сферы, але выклікаюць занепакоенасць у плане меркаванай адмены дэкрэтаў і ўказаў па дадатковых мерах стымулявання працы работнікаў, якія знаходзяцца на кантрактнай форме найму, па асобных катэгорыях маладых спецыялістаў, губляюцца даплаты за вучоныя ступені і званні. Мы лічым, што гэтыя праекты патрабуюць тлумачэнняў і руплівай дапрацоўкі, — агучыў пазіцыю галіновага прафсаюза Аляксандр Бойка.

СПРАШЧЭННЕ АТЭСТАЦЫІ

Варта нагадаць, што ў студзені мінулага года ўрад прыняў рашэнне, згодна з якім маладым спецыялістам з катэгорыі педагагічных работнікаў, якія ўжо адпрацавалі па размеркаванні два гады, але працягваюць працаваць у гэтай жа ўстанове адукацыі, яшчэ на год была падоўжана выплата даплаты ў памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду. Зроблена гэта было для таго, каб не дапусціць зніжэння заробкаў у маладых спецыялістаў і іх адтоку з устаноў адукацыі. Захаванне даплаты яшчэ на адзін год дае магчымасць маладым педагогам прайсці атэстацыю для атрымання другой кваліфікацыйнай катэгорыі.

Яшчэ адзін важны, на думку кіраўніцтва міністэрства і прафсаюза, крок — унясенне змяненняў у Інструкцыю аб атэстацыі педагагічных работнікаў. У прыватнасці, быў адменены абавязак пацвярджаць прысвоеную больш як пяць гадоў назад вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю і катэгорыю «настаўнік-метадыст». Быў пашыраны пералік педагагічных работнікаў, якія дапускаюцца да атэстацыі на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі без уліку стажу работы на пасадзе. Пашыраны паўнамоцтвы начальнікаў управленняў адукацыі абласных выканаўчых камітэтаў і старшыні камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама. Яны атрымалі права даваць згоду на допуск педагагічных работнікаў да атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі без уліку прысвоенай раней кваліфікацыйнай катэгорыі або стажу работы на пасадзе. Раней для гэтага патрабавалася згода міністра.

— Мы ведаем, што ўнясенне змяненняў у інструкцыю ўлічыла меркаванне асноўнай масы педагогаў, — пакрэсліў Сяргей Руды. — Заўвагі і прапановы ЦК прафсаюза таксама былі ўлічаны.

Намеснік міністра адукацыі паведаміў, што пачынаючы з 2015 года ў краіне рэалізуецца пілотны праект па апрабацыі нарматыўнага фінансавання ўстаноў адукацыі. Яго мэта — забеспячэнне прозрыстасці і справядлівасці размеркавання бюджэтных сродкаў. У 2017 годзе ім былі ахоплены 642 установы агульнай сярэдняй і 94 установы дашкольнай адукацыі. **З 1 студзеня 2019 года на нарматыўнае фінансаванне павінна перайсці ўся сістэма агульнай сярэдняй адукацыі,** з 1 студзеня 2020 года — сістэма дашкольнай адукацыі, а ў 2021 годзе — прафесійна-тэхнічная і сярэдняя спецыяльная адукацыя.

— Падчас рэалізацыі пілотнага праекта намеціліся як станоўчыя тэндэнцыі, так і праблемныя моманты, — канстатаваў Сяргей Руды. — Таму мы просім прафсаюз: уносьце разумныя прапановы па карэкціроўцы падыходаў, звязаных з нарматыўным фінансаваннем.

УВАГА — КАЛЕКТЫЎНАМУ ДАГАВОРУ

Аляксандр Бойка лічыць удзел у інфармацыйных праектах Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, выступленні ў рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ найважнейшай задачай дзейнасці галіновага прафсаюза.

— Трэба больш актыўна выкарыстоўваць для падняцця прэстыжу работнікаў галіны тэлевізійныя праекты Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, — адзначае ён. — На пастаяннай аснове на беларускім тэлебачанні выходзяць дзве прафсаюзныя праграмы — «Народная раніца» і «Адкрытая размова». Галоўны герой «Народнай раніцы» — звычайны чалавек працы: настаўнік, вучоны, будаўнік. Ім можа стаць кожны. Летась героямі перадачы сталі два прадстаўнікі сістэмы адукацыі: дырэктар ашмянскай школы № 1 Міхаіл Мар'янавіч Гружэўскі і дырэктар віцебскай гімназіі № 1 Валянціна Трафімаўна Шырокава.

Тэлевізійны праект ФПБ і канала СТВ перадача «Адкрытая размова» выходзіць штотыдзень і закліканы прадэманстраваць, як прафсаюзы дапамагаюць грамадзянам вырашаць іх рабочыя пытанні: наймальнік не працягнуў кантракт, не выплачвае кампенсацыю за траўму... У мінулым годзе з удзелам прадстаўнікоў прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі выйшлі ў эфір чатыры выпускі перадачы, у якіх абмяркоўваліся тэмы працаўладкавання падлеткаў, падрыхтоўкі дзіцячых аздараўленчых лагераў, работы студэнцкіх прафкамаў, аказання дабрачыннай дапамогі.

Між іншым, у 2017 годзе ў арганізацыйныя структуры прафсаюза паступіла больш за 63 тысячы зваротаў ад яго членаў. Аналіз паказаў, што найбольш тыповыя парушэнні заканадаўства аб працы адбываюцца пры звальненні работнікаў па ініцыятыве наймальнікаў; пры заключэнні, падаўжэнні і скасаванні кантрактаў; прымяненні мер дысцыплінарнага спагнання; заключэнні калектыўных дагавораў; аплаце і матэрыяльным стымуляванні працы.

Па стане на 1 студзеня гэтага года ў галіне адукацыі было заключана 6878 калектыўных дагавораў. Летась Беларускі прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі правёў Рэспубліканскі конкурс на найлепшы калектыўны дагавор (пагадненне). Перамагла ў ім сталічная сярэдняя школа № 51. У ЦК прафсаюза разглядаюць калектыўны дагавор як крыніцу дадатковых для работнікаў сферы адукацыі сацыяльных ільгот і гарантый, таму і ўдзяляюць яму такую вялікую ўвагу.

Надзея НІКАЛАЕВА

• **Вышэйшая школа**

НОВЫЯ ГАРЫЗОНТЫ ДЛЯ КІТАЙСКАЙ МОВЫ

Першы ў Беларусі факультэт кітайскай мовы і культуры адкрыўся ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.

Ён будзе рыхтаваць выкладчыкаў, перакладчыкаў і спецыялістаў па міжкультурнай камунікацыі ў сферы знешнеэканамічных сувязяў, сувязяў з грамадскасцю і міжнароднага турызму. Факультэт кітайскай мовы і культуры мае цесныя кантакты з Усходне-Кітайскім педагагічным універсітэтам, Пекінскім універсітэтам замежных моў, Цяньцзіньскім універсітэтам замежных моў і Шанхайскім універсітэтам замежных моў. У структуры факультэта будуць функцыянаваць дзве кафедры: кафедра тэорыі і практыкі кітайскай мовы і кафедра мовазнаўства і прафесійнай камунікацыі.

■ Космас

СМЕЦЦЕ КАЛЯ ДАЛЁКАЙ ПЛАНЕТЫ? ГЭТА «БРАТЫ ПА РОЗУМЕ»!



Наша Зямля акружаная велізарнай «бурбалкай» касмічнага смецця. Калі паглядзець на карту з выявай усіх рукатворных аб'ектаў, якія цяпер знаходзяцца на арбіце, стане зразумела, што ў нас над галовамі лётае не два-тры абломкі ракет ці спадарожнікаў. Ды што там, наверсе ўжо проста гіганцкая звалка! Гэты даволі сумны факт падштурхнуў астранома Гектара Сокас-Навара да цікавай думкі, якой ён падзяліўся з чытачамі навуковага выдання Astrophysical Journal.

Навара працуе ў Інстытуце астрафізікі на Канарскіх астравах і вялікую частку працоўнага часу вывучае Сонца. Чым больш спадарожнікаў з'яўляецца на арбіце Зямлі, тым больш непразрыстым становіцца гэтая самая «бурбалка» са смецця і дзеючых касмічных апаратаў. Вучоны выказаў здагадку, што тэхналагічна прасунутыя іншапланецяне, якія ўступілі ў касмічную эру, таксама спачатку будуць пасылаць мноства касмічных караблёў і спадарожнікаў на арбіту, якія ўтвараюць пояс, здольны пакінуць след на крывой бляску маці-зоркі падчас транзіту.

Навакольнае смецце, якое акружае планету, Навара назваў поясам Кларка і правёў шэраг даследаванняў, згодна з якімі дзесяціметровы тэлескоп, што працуе ў ІЧ-дыяпазоне, цалкам здольны зарэгістраваць штучнае смецце вакол Проксімы b (калі такое маецца). Гэты ж тэлескоп можа «ўбачыць» пояс Кларка вакол большасці планет сістэмы TRAPPIST-1 — TRAPPIST-1d, -e і -f.

Але з планетамі, аналагічнымі Зямлі, усё не так проста. Калі яна круціцца вакол зоркі, падобнай Сонцу, сучасныя інструменты пакуль не змогуць разгледзець вакол яе сляды пазаземнай цывілізацыі. Улічваючы тэмп развіцця сучасных тэхналогій, вельмі прасунутыя тэлескопы, здольныя на гэта, змогуць выявіць пояс Кларка на арбіце іншай планеты, падобнай на Зямлю, гадоў праз 200, ніяк не раней.

Адзіная праблема, звязаная з выяўленнем іншапланецян такім спосабам, заключаецца ў тым, што касмічнае смецце можна лёгка пераблытаць з натуральнымі кольцамі, якія знаходзяцца ў наваколлі патэнцыйна заселенай планеты. Але Навара ўпэўнены, што наступныя назіранні дапамогуць адрозніць адно ад другога, ды і даследаванні самой планеты змогуць дапамагчы ў вырашэнні задачы

■

■ Ну і ну!

РОБАТ, ЯКІ ВЫКОНВАЕ МУЖЧЫНСКУЮ МАРУ

А менавіта адну з, так бы мовіць, асноўных — каб за цябе хто-небудзь што-небудзь зрабіў.

Каманда нямецкіх студэнтаў-праграмістаў з PAL Robotics у імкненні выйграць конкурс NVIDIA Jetson Developer Challenge навучыла аднарукага гуманоіднага робата-памочніка TIAGo вельмі нечаканай і прыемнай менавіта для мужчын здольнасці — шукаць шлях да халадзільніка, каб прынесці адтуль карыстальніку піва патрэбнай маркі. Самым заўзятым гультаям, халасцякам і тым, каму раніцай прыйдзецца вельмі «цяжка» пасля ўчарашняга, у будучыні, магчыма, будзе прадастаўлены шанц абзавесціся неацэнным памочнікам для такіх сітуацый.

Глядзельным цэнтрам для робата стаў модульны камп'ютар NVIDIA Jetson TX2, прызначаны для хуткага рашэння алгарытмаў штучнага інтэлекту, у тым ліку машыннага зроку. У выніку TIAGo здольны пабудаваць свой маршрут да халадзільніка, знайсці ручку кухоннага агрэгата, адчыніць дзверцы, знайсці на паліцах сярод іншай ежы запатрабаванае «гаспадаром» піва, арыентуючыся па этыкетцы на бутэльцы або бляшанцы і форме тары (каманда пры гэтым аддаецца голасам), узяць напой маніпулятарам , зачыніць дзверцы і адправіцца ў зваротны шлях да гультаяватага заказчыка хмельнага зелля. Сам праект немцаў знаходзіцца ў адкрытым доступе, яго апісанне ёсць на сайце каманды разам з інструкцыяй па запуску. Што ж, засталося толькі каму-небудзь навучыць робата адкаркоўваць бутэлькі віна без штопара ці з ім, а таксама адкрываць шампанскае, не праліўшы ні кроплі

■

■ Знаходкі

ЗНОЙДЗЕНА НАЙСТАРЭЙШАЕ ПАСЛАННЕ Ў БУТЭЛЬЦЫ

На пляжы Заходняй Аўстраліі была знойдзена бутэлька з лістом, датаваным 1886 годам. Як стала зразумела з яго, бутэлька была скінутая больш за стагоддзе таму з карабля ў Індыйскім акіяне, прыкладна за 950 кіламетраў ад месца знаходкі, перадае ScienceAlert.

Ліст у бутэльцы знайшла мясцовая жыхарка Тоня Ілман у пачатку гэтага года, за 50 метраў ад берагавой лініі. Дзіўна, што хоць у бутэльцы не было корка, яна сама ў цэлым і яе змесціва былі ў даволі добрым стане. Ліст, як высветлілася, быў часткай эксперыментаў, якія праводзіліся нямецкімі даследчыкамі з 1864 да 1933 года, для вывучэння акіянічных плыняў. У гэты час з нямецкіх караблёў скідаліся тысячы падобных бутэлек, кожная з якіх утрымлівала ліст, які паведамляў дату, дакладныя каардынаты карабля (у момант адпраўкі ліста), яго назву, порт рэгістрацыі і маршрут, па якім ішло судна. Пры гэтым на адваротным баку ліста знаходзіўся анкетны бланк, у якім той, хто знайшоў бутэльку, паказаў бы, калі і дзе яна была выяўлена, а затым накіраваў бы ў германскую марскую абсерваторыю ў Гамбургу ці ў найбліжэйшае нямецкае консульства. Як вынікае са знойдзенага ліста, ён быў адпраўлены 12 чэрвеня 1886 года з карабля пад назвай «Паўла», які ішоў з Кардыфа на Мадагаскар.

Сям'я Ілманаў аднесла бутэльку з лістом у Музей Заходняй Аўстраліі. Спецыялісты пацвердзілі, што ў пасланні напісана дакладная дата: сапраўды, карабель «Паўла» ішоў па адпаведным маршруце ў 1886 годзе. Хоць у рамках эксперымента з нямецкіх караблёў скідаліся тысячы такіх бутэлек, знойдзенае пасланне стала ўсяго толькі 663-м знойдзеным з іх на цяперашні момант.

